ПУНКТЫ РОСТУ СЛУЧЧЫНЫ І ЗЭЛЬВЕНШЧЫНЫ
4

ВЕРА ПАЛЯКОВА: У ЧЫМ СІЛА ДОБРАГА АРТЫСТА?
21

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

30 СНЕЖНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 252 (29621)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Алег НАВІЦКІ, лётчык-касманаўт, Герой Расіі:

«Сёння, пасля знаёмства з даследаваннямі і распрацоўкамі беларускіх вучоных на сустрэчы ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, я яшчэ раз атрымаў пацвярджэнне высокага патэнцыялу беларускай навукі, які неабходна выкарыстоўваць на карысць нашых дзяржаў і нашых людзей. Гатовы зрабіць усё, што залежыць ад мяне. Толькі сумеснымі намаганнямі мы можам паказаць сілу нашай сумеснай навукі ў самых прарыўных навуковых напрамках».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Любую прапанову, якую мы ўносім, вы робіце даручэннем»

Перагаворы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі прайшлі ў Санкт-Пецярбургу

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі актуальныя пытанні беларуска-расійскага супрацоўніцтва. Перад пачаткам сустрэчы Уладзімір Пуцін асабіста заехаў на машыне за Аляксандрам Лукашэнкам, паведаміла прэс-служба беларускага Прэзідэнта.

Фота БелТА.

Прэсу дапусцілі толькі на пачатак афіцыйнай часткі перагавораў і тое на пару хвілін для пратакольнай здымкі.

Прэзідэнт Беларусі падзякаваў расійскаму боку, і перш за ўсё асабіста калегу Уладзіміру Пуціну, за падтрымку Беларусі ў цяжкі санкцыйны час. «Я вам вельмі ўдзячны, вам асабіста перш за ўсё, за тое, што вы зрабілі для Беларусі. І за тую падтрымку, якую вы аказваеце нам. Не хачу вам ліслівіць. Справа не ў ліслівасці. А ў тым, што любую прапанову, якую мы ўносім, або просьбу, — вы робіце даручэннем тым ці іншым людзям. Адгукаюцца і кампаніі расійскія, і ўрад, і банкі ідуць насустрач, падтрымліваючы нас у гэты цяжкі санкцыйны час», — падкрэсліў кіраўнік краіны, адзначыўшы, што санкцыйныя пакеты ў адносінах да Беларусі плануюць пашыраць.

СТАР. 2

НОВЫ ГОД — У НОВЫМ ДОМЕ

Фота БелТА.

Выдатны падарунак да свята атрымала сям'я СЯРНОВЫХ з Гарадка. Ім і яшчэ сямі шматдзетным сем'ям уручылі ключы ад кватэр у новабудоўлі.

КАРАТКА

• Беларускі Дзед Мароз аддаў пагранічнікам загад прапусціць Новы год праз граніцу.

• **Свята для выхаванцаў Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў правяла Прэзідэнцкая бібліятэка. Асноўнай тэмай выставы стаў Год народнага адзінства.**

• БЧ прапануе навагоднія скідкі на білеты за тры гадзіны да адпраўлення на асобныя цягнікі ў Расію.

• **Вытворчасць вакуумных прабірак для забору вянознай крыві адкрылі ў Гомелі. Тут будуць вырабляць 121 падвід прабірак рознага памеру і аб'ёму.**

• «Амікрон» выяўлены ў 4 чалавек у Беларусі. Ва ўсіх пацыентаў адзначаецца лёгкае цячэнне захворвання.

Сацыяльны праект «Дажынкі»

ШТУРШОК ДА РАЗВІЦЦЯ

Вынікі добраўпарадкавання будуць служыць людзям доўгія гады

Нагодай для грунтоўнага добраўпарадкавання ў Велікарыце стала, можна сказаць, надзвычайная сітуацыя. Увечары 6 ліпеня мінулага года на паўднёвыя раёны Брэстчыны абрынуўся моцны ўраган. Навакольны лес паламала і спляжыла палосамі. Вялікія дрэвы ў населеных пунктах месцамі вывернула з карэннем і зямлёй, ад іх засталіся воронкі, нібы ад выбуху бомбы. Пацярпелі дамы і гаспадарчыя пабудовы, могілкі. Наступствы ўрагану ліквідавалі працяглы час. На дапамогу вяскоўцам выязджалі гараджане, правялі не адзін суботнік.

СТАР. 19

ISSN 1990 — 763X

«Любую прапанову, якую мы ўносім, вы робіце даручэннем»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт Беларусі назваў заслугай Расіі і іншых сяброў на міжнароднай арэне павышэнне ВУП краіны за санкцыйны год на фоне пандэміі. «Як бы ні складваліся адносіны, мы ў даўгу ніколі не застанемся. Беларусы ў даўгу не застануцца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы станоўча ацаніў вынікі нефармальнага саміту СНД, які прайшоў у Санкт-Пецярбургу за дзень да перагавораў, назваўшы яго добрым і цёплым мерапрыемствам.

«Мы яшчэ раз убачылі, што кіраўнікі постсавецкіх рэспублік, і Беларусі ў тым ліку, выдатна разумеюць сітуацыю, якая вакол нас, і разабраліся ва ўсіх хітраспляценнях сусветнай палітыкі дзякуючы Расіі. Вядома, Расіі дастаецца заўсёды і дасталося ад гэтага. Але вы паказалі гэтым самым сваю надзейнасць», — заявіў беларускі Прэзідэнт.

Кіраўнікі дзяржаў пацвердзілі планы аб правядзенні сумесных ваенных вучэнняў на тэрыторыі Беларусі ў 2022 годзе. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта пойдзе на карысць беларуска-расійскім адносінам. Пагутарылі кіраўнікі краін і пра супрацоўніцтва ў ВПК.

«Я звярнуўся да вас, каб мы не спынялі нашы сумесныя вучэнні, каб мы працягнулі стварэнне цэнтраў па навучанні нашых хлопцаў карыстацца новымі ўзорамі ваеннай тэхнікі, што мы ў Расіі купляем. Мы гэта робім, і працэс навучання спыняць не трэба», — сказаў Аляксандр Лукашэнка і рэзюмаваў заявай, што краіны супрацоўнічаюць па ўсіх кірунках.

Кіраўнікі дзяржаў дамовіліся і аб прамысловай кааперацыі ў авіябудаўніцтве. «У нас ёсць і грамадзянскія, і ваенныя заводы па авіябудаўніцтве. Мы шмат можам рабіць па кааперацыі, тым больш яна запатрабавана для расійскага авіябудавання», — заўважыў Прэзідэнт Беларусі.

«Абсалютна. Па выніках нашай сустрэчы гэта яшчэ адно даручэнне ўраду», — падтрымаў ідэю Уладзімір Пуцін.

Увечары кіраўнікі краін сустрэліся ўжо на лёдзе. Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін па традыцыі змянілі пінжакі на джэрсі з нумарамі 01 і 11 адпаведна і паўдзельнічалі ў хакейным матчы.

Падарункі на свежым паветры

«SOS — Дзіцячая вёска Мар'іна Горка» прымала падарункі ад Міністэрства інфармацыі і Выдавецкага дома «Звязда»

У самы пярэдадзень Новага года па традыцыі міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПЯРЦОЎ наведаў «SOS — Дзіцячая вёска Мар'іна Горка». Салодкія падарункі і кнігі ад дзяржаўных выдавецтваў краіны былі ўручаны дзецям, якія жывуць у некалькіх сямейных дамах.

— Мы даўно пасябравалі з Міністэрствам інфармацыі, — расказвае дырэктар установы Дзмітрый КАЛТОВІЧ. — Ведаем, што да нас на святочную ёлку заўсёды прыязджае кіраўнік ведамства, супрацоўнікі міністэрства. Ды і не толькі ў пярэдадзень Новага года мы сустракаемся, памятаю, што з міністрам дзеці і ў футбол гулялі.

Сёлета пандэмія налажыла свой адбітак на характар і арганізацыю мерапрыемства. Нягледзячы на крыху марознае надвор'е, удзельнікі свята сабраліся каля ўпрыгожанай ёлкі на вуліцы. Тут былі ўручаны падарункі, прайшлі выступленні гасцей, бо свята паводле сцэнарыя праходзіла на свежым паветры. Выступаючы з прывітальным словам, Уладзімір Пярцоў пажадаў шчасця, удачы, поспеху насельнікам «SOS — Дзіцячая вёска Мар'іна Горка». Пажадаў усім маладым людзям ісці па жыцці цвёрда і таксама не забывацца на добрую кнігу, на тыя бязмежныя веды, якія яна ў сабе ўтрымлівае і перадае іх — працавітым, руплівым, усім тым, хто настойліва цягнецца да асветы, адукацыі, з малых гадоў шукае сваю прафесію, робіць свой грамадзянскі выбар, жыве з любоўю да сваёй Айчыны.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

На ўрачыстасці выступіла і генеральны дырэктар праекта «SOS — дзіцячыя вёскі Беларусі» Таццяна БУРАВА. Дарэчы, падобныя на мар'інагорскае паселішчы з домікамі сямейнага тыпу ёсць яшчэ па двух адрасах краіны. Сваё віншаванне ўдзельнікам навагодняга свята ў Мар'інагорскай дзіцячай вёсцы агучыла і начальнік упраўлення па адукацыі, спорце і турызме Пухавіцкага райвыканкама Ала СКОРАЯ (нагадаем: Мар'іна Горка — раённы цэнтр Пухавіччыны).

А намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» Уладзімір МОСІН уручыў хлопчыкам і дзяўчынкам вялікую бібліятэку кніг для малодшых школьнікаў і падлеткаў. Яе набыццё прафінансавала **Беларуская ўніверсальная таварная біржа**. Дарэчы, гэтая вядомая ў краіне структура падтрымала і набыццё кніг для іншых падобных дзіцячых устаноў краіны. «Звяздоўцы» раней уручылі бібліятэчкі з творамі беларускіх пісьменнікаў у Гродне, у Івянцы на Міншчыне, а яшчэ на Магілёўшчыне.

— Мы і надалей будзем ладзіць падобныя праекты, стараючыся распаўсюдзіць кнігі Выдавецкага дома «Звязда» як мага шырэй, — пракаментаваў Уладзімір Мосін падзею ў Мар'інай Горцы. — У 2022 годзе светачам у гэтай рабоце стануць юбілеі нашых класікаў — 140-годдзе з дня нараджэння народных песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Сяргей ШЫЧКО.

Блізкая ўлада

Прыярытэт палітыкі — людзі

Спікер верхняй палаты парламента сустрэлася з загадчыкамі ўстаноў дашкольнай адукацыі сталіцы

У Савеце Рэспублікі адбылася зацікаўленая гутарка «без купюр»: Наталля КАЧАНАВА па традыцыі не абмяжоўвала гасцей у тэмах, якія яны хацелі абмеркаваць. У цэнтры ўвагі былі пытанні як грамадскага, так і асабістага характару.

— Нам вельмі важныя размовы, сустрэчы ў калектывах, на прадпрыемствах, у арганізацыях. Мы выкарыстоўваем усе формы і метады работы з людзьмі, бо нам важна ведаць, што адбываецца ва ўсіх сферах жыццядзейнасці нашай краіны, і для сябе пазначыць, як гэта рэалізаваць у тых нарматыўных прававых, заканадаўчых актах, над якімі ў далейшым нам прыйдзецца працаваць. А дзесьці выступаць і з ініцыятывамі, таму што свет мяняецца вельмі дынамічна, — падкрэсліла яна.

Спікер звярнула ўвагу на сітуацыю, якая склалася ў свеце, і адзначыла: неабходна працаваць на апераджэнне, прымаючы законы, патрэбныя краіне і людзям на дадзеным этапе.

— Калі мы працавалі над новым праектам Канстытуцыі, вядома, выкарыстоўвалі і тое, пра што казалі людзі. Для нас гэта вельмі важна, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі акцэнтавала ўвагу прысутных на сацыяльна арыентаваным вектары дзяржаўнай палітыкі:

— Прыярытэт нашай палітыкі — людзі. Мы вельмі ўважліва ставімся да таго, аб чым гавораць людзі ў сацыяльным плане. Жыццё паказвае, што гэта абсалютна правільныя падыходы.

Спікер верхняй палаты парламента расказала, што з глыбокай павагай ставіцца да тых, хто працуе ў сістэме адукацыі, дашкольных установах, сацыяльна-педагагічных цэнтрах, дзіцячых дамах.

— Выхоўваць дзяцей заўсёды няпроста. Мы разумеем, што гэта праца вельмі цяжкая, але ад вас шмат у чым залежыць будучыня нашай краіны, — пераканана Наталля Качанава. — Калі ты на жыццёвым шляху сустрэнеш добрага педагога, выкладчыка, табе па жыцці гэта дапаможа, няма ніякага сумневу.

Тэму ўплыву на будучыню краіны спікер верхняй палаты парламента працягнула тэзісам, які часта гучыць з яе вуснаў: яна залежыць ад кожнага з нас.

— Усё, што адбываецца ў тваёй краіне і што будзе заўтра, і ў якой краіне мы будзем жыць, — залежыць ад кожнага з нас. Калі мы будзем гэта разумець і шанаваць тое, што маем, тады і вынік будзе хуткі і больш эфектыўны, — пераканана яна.

Старшыня Савета Рэспублікі акцэнтуе ўвагу: асноватворнае — гэта законы і адзінства ў краіне.

— На вас усклалася асаблівая місія, — звярнулася яна да ўдзельнікаў сустрэчы. — Вы павінны зрабіць усё, каб маленькія дзеткі ўжо разумелі, што жывуць у краіне, дзе іх любяць, што гэтая краіна добрая і тут усё робіцца для дабрабыту людзей.

Акрамя таго, Наталля Качанава шчыра адказала на ўсе пытанні, якія прагучалі падчас сустрэчы. У прыватнасці, у гутарцы закраналіся такія тэмы, як шкода наркаманіі і неабходнасць весці тлумачальную работу з самага ранняга ўзросту. Разважалі пра брыдкаслоўе і важнасць з ранніх гадоў сачыць за чысцінёй мовы, пра барацьбу з ковід-інфекцыяй і закупку з дзяржаўнага бюджэту вакцыны і іншых неабходных медыкаментаў.

Таксама ўдзельнікі сустрэчы папрасілі спікера верхняй палаты парламента падтрымаць ініцыятыву аб унясенні паправак у закон аб ліцэнзаванні ў сістэме адукацыі. У прыватнасці, яны паведамілі, што настаўнікамі пачатковых класаў у адной прыватнай установе адукацыі працуюць, напрыклад, інжынер-механік і інжынер-праграміст.

— Так быць не павінна. Гэты від дзейнасці павінен быць ліцэнзаваны, — пераканана Наталля Качанава і паабяцала падтрымку ініцыятывы.

Напрыканцы сустрэчы, якая атрымалася па-навагодняму цёплай і ўтульнай, Наталлі Качанавай падарылі ўпрыгожанні на ёлку, якія зрабілі выхаванцы дзіцячых садкоў сталіцы.

Вольга АНУФРЫЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Трэць амерыканцаў не прызналі перамогу Байдэна на выбарах

Трэць грамадзян ЗША так і не прызналі законнай перамогу прэзідэнта ЗША Джо Байдэна на выбарах у 2020 годзе, паведамляе Масачусецкі ўніверсітэт у Амхерсце са спасылкай на вынікі апытання, апублікаваныя на сайце.

Паводле інфармацыі ўніверсітэта, 11 працэнтаў рэспандэнтаў назвалі перамогу Байдэна «магчыма нелегітымнай», яшчэ 22 працэнты палічылі яе «адназначна нелегітымнай». Адзначаецца, што сярод рэспубліканцаў, якія паўдзельнічалі ў апытанні, перамогу дзеючага кіраўніка дзяржавы не прызнае больш як 70 працэнтаў грамадзян, а сярод дэмакратаў — толькі чатыры працэнты.

Палітолаг Таціш Нтэта адзначыў, што рэспубліканскія чыноўнікі, кансерватыўныя СМІ і паслядоўнікі былога прэзідэнта ЗША Дональда Трампа працягваюць сумнявацца ў законнасці перамогі Байдэна. «Нядзіўна, што сем з дзесяці рэспубліканцаў, кансерватараў і выбаршчыкаў Трампа ставяцца да вынікаў выбараў 2020 года са скептыцызмам, калі не з відавочным недаверам», — сказаў на заканчэнне ён.

У лістападзе паведамлялася, што рэйтынг адабрэння палітыкі Байдэна сярод амерыканцаў дасягнуў новага антырэкорду і апусціўся да мінімальнага значэння за ўвесь час яго знаходжання на пасадзе. Паводле апошніх апытанняў, больш за палову амерыканцаў не ўхваляе работу дзеючага кіраўніка дзяржавы.

Жанчыны ў Кабуле выйшлі на пратэст і запатрабавалі ад ЗША размарозіць дзяржрэзервы

Дзясяткі жанчын у афганскай сталіцы Кабул выйшлі на акцыю пратэсту і запатрабавалі, каб Злучаныя Штаты размарозілі дзяржрэзервы Афганістана. Пра гэта паведамляе Aamaj News.

Афганкі арганізавалі мітынг з-за цяжкага эканамічнага становішча. Яны скандіравалі лозунгі з заклікам да адміністрацыі прэзідэнта ЗША Джо Байдэна вярнуць грошы ў краіну.

Раней дырэктар дэпартамента міжнародных арганізацый МЗС РФ Пётр Ілычоў прадказаў катастрофу сусветнага маштабу з-за крызісу ў Афганістане, калі заходнія краіны не размарозяць афганскія рахункі.

У сярэдзіне жніўня, пасля таго як талібы захапілі ўладу ў краіне, Міжнародны валютны фонд і іншыя заходнія арганізацыі прыпынілі праграмы падтрымкі афганскай эканомікі, якая залежыць ад замежных улівання. У прыватнасці, ЗША перакрылі доступ да актываў на сем мільярдаў долараў, якія захоўваюцца ў амерыканскай Федэральнай рэзервовай сістэме.

Расіяне назвалі самыя бескарысныя падарункі на Новы год

Расіяне пералічылі самыя бескарысныя падарункі на Новы год, вынікае з апытання Усерасійскага цэнтра вывучэння грамадскай думкі (УЦВГД).

Так, 6 % удзельнікаў апытання назвалі сярод самых непатрэбных падарункаў сувеніры і статуэткі, 3 % — кухоннае начынне, сталовыя прыборы, па 2 % — шкарпэткі, цацкі, прысмакі і шакалад.

Пры гэтым каля 7 % грамадзян назвалі бескарыснымі ўсе падарункі, атрыманыя на Новы год. Аднак 71 % рэспандэнтаў адзначылі, што ніколі не атрымлівалі непатрэбных падарункаў. 27 % прызналіся, што атрымлівалі.

Магчымасці для стабільнага развіцця грамадства і дзяржавы

Працягваем абмяркоўваць з экспертамі — і гэта не гучнае слова, бо экспертам у дадзеным выпадку можа быць кожны грамадзянін Беларусі — Праект змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Калі вы яшчэ не паспелі азнаёміцца з прапанаванымі на ўсенароднае абмеркаванне навацыямі, іх на беларускай мове можна пачытаць у нумары «Звязды» за аўторак, 28 снежня, або на нашым сайце zviazda.by.

Алег ДЗЯЧЭНКА, член Савета Рэспублікі, прарэктар па вучэбнай рабоце Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова:

— Дзеючая Канстытуцыя ў цэлым правільна адлюстроўвае заканамернасці грамадскага развіцця, інтарэсы асобы, грамадства і дзяржавы. Але з моманту яе прыняцця прайшло больш за чвэрць стагоддзя. За гэты час істотна змяніўся навакольны свет. Змянілася структура нашай эканомікі, беларускага грамадства ў цэлым. Вырасла і ўступіла ў жыццё цэлае пакаленне беларусаў, якія нарадзіліся ў незалежнай і суверэннай Беларусі.

І на міжнароднай арэне ўзнікла шмат новых, прынцыпова важных з'яў і працэсаў. Па перыметры граніц нашай міралюбівай дзяржавы ўтварылася «агрэсіўная дуга» з некалі дружалюбных нам краін, якія сёння фактычна знаходзяцца пад знешнім кіраваннем. Апошнім часам палітычныя рэжымы на гэтых сумежных тэрыторыях перайшлі ад ваяўнічай рыторыкі да правакацый, гібрыднай вайны і маштабнай падтрымкі палітычных экстрэмістаў з ліку заўзятых праціўнікаў нашага ладу і функцыянуючых у інтарэсах заходніх геапалітычных гігантаў. Таму ўмовы, у якіх мы жывём і працуем, значна змяніліся і ўскладніліся.

Адказам на гэтыя сучасныя выклікі стала па-сапраўднаму ўсенародная кампанія па выпрацоўцы прапанову у праект Асноўнага Закона нашай краіны, які прадстаўлены на абмеркаванне народу Беларусі.

У Праекце змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь улічваюцца новыя з'явы і акалічнасці, якія адлюстроўваюць не толькі бягучыя рэаліі, але і дазваляюць вырашаць задачы доўгачасовага парадку.

Папярэдні аналіз праекта паказаў, што ў ім закладзены вялізныя магчымасці для далейшага стабільнага грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця сучаснага грамадства і дзяржавы з улікам шматвяковых традыцый, нацыянальных каштоўнасцяў і інтарэсаў беларускага народа.

Ірына ЛУКАНСКАЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па заканадаўстве:

— Асноўны заканадавец Канстытуцыі — народ. Адсюль і змяненні. На сёння Канстытуцыя дапаўняецца тымі складнікамі, якія прадыктаваны часам і новымі выклікамі.

Свет вакол нас розны. У тым ліку не заўсёды добразычлівы. Калі раней у Канстытуцыі было прапісана, што мы, народ Беларусі, маем права на самавызначэнне, цяпер гэта дапаўняецца яшчэ і правам на захаванне нацыянальнай самабытнасці, суверэнітэту. Мы хочам бачыць сваю краіну незалежнай і суверэннай, самастойнай, моцнай і квітнеючай. Такой імкнёмся перадаць яе і сваім нашчадкам, будучым пакаленням. Таму ўведзены гэтыя два паняцці — захаванне нацыянальнай самабытнасці і суверэнітэту.

На што яшчэ хочацца звярнуць увагу. Народ Беларусі абапіраецца не толькі на шматвяковую гісторыю, культурныя і духоўныя традыцыі. Сцвярджаюцца правы і свабоды чалавека і грамадзяніна, устоі прававой дзяржавы і сацыяльна абароненага грамадства.

Дзеля чаго гэта робіцца? Каб захаваць мір, дабрабыт, стабільнасць грамадзян краіны. Менавіта гэта прапісана літаральна ў першых радках праекта новага варыянта Канстытуцыі. Ці не такімі словамі выказваем мы пажаданні сваім блізкім, родным, сябрам падчас урачыстых падзей ці сяброўскіх сустрэч? Гэта тое, што важна для кожнага.

Увогуле, Асноўны Закон дапаўняецца адзінаццаццю артыкуламі. Вельмі ўзмоцнена пазіцыя па маладзёжнай палітыцы. Мяне, як жанчыну і маці, узрадавала канкрэтызацыя паняцця шлюбу. Гэта традыцыйная сям'я, менавіта саюз мужчыны і жанчыны.

На сёння складваецца паняцце, што свет крыху пахіснуўся ў гэтым сэнсе. Ідзе прапаганда аднаполых шлюбаў. Але лічу, што мы павінны жыць у тым ліку і па Божых запаветах, чалавек павінен працягваць свой род, клапаціцца аб сваіх нашчадках, а тыя ў сваю чаргу — аб сваіх бацьках. Гэта таксама закладзена ў Канстытуцыі — сацыяльная абароненасць як дзяцей, так і састарэлых бацькоў. І гэта правільна.

Свет не стаіць на месцы, усё хутка развіваецца. Таму нам трэба паспяваць за новымі інфармацыйнымі тэхналогіямі. Гэта таксама знайшло адлюстраванне ў прапанаваным варыянце Канстытуцыі.

Лічу важным, што Канстытуцыя дапоўнена такім значным палажэннем, як сістэма народнай улады. І ў гэтым плане новым стала палажэнне па такім важным палітычным органе, як Усебеларускі сход. Гэта народны форум, куды збіраюцца людзі з усіх куткоў краіны, выказваюць свой пункт гледжання. Калі раней Усебеларускі сход збіраўся раз на пяць гадоў, у новым праекце прапаноўваецца праводзіць форум штогод. Прапісаны і адзіны дзень галасавання для дэпутатаў усіх узроўняў — ад мясцовых Саветаў да парламента. Бо ў такой адзінай дэпутацкай камандзе значна эфектыўней можна вырашаць праблемы. Гэта на сёння наспела. І ўвогуле хачу сказаць, што адзінства народа — падмурак Канстытуцыі.

У праекце таксама напісана, што Асноўны Закон мае першачарговае права на выкананне. І гэта слушна. Бо Канстытуцыя краіны вышэй за ўсе міжнародныя акты. Як грамадзянін, як чалавек, як дэпутат парламента, як маці, лічу вельмі важным захаваць незалежнасць нашай моцнай краіны.

Дзяніс КАРАСЬ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі:

— Праект нашай будучай Канстытуцыі накіраваны на змяненні з улікам часу — ён дыктуе свае ўмовы, і пад іх прыходзіцца падстройвацца, у тым ліку ўносячы змяненні ў Асноўны Закон краіны. У новым праекце адлюстраваны палажэнні згодна новым трэндам — ахова персанальных даных, статус палітычных партый і інш.

Адзін з прынцыпаў народаўладдзя, які мы ўпісваем ў Асноўны Закон, — Усебеларускі народны сход. Гэта не новы орган, але яго замацаванне ў Канстытуцыі кажа многае пра эталоны дэмакратыі.

Канстытуцыя будзе разглядацца на рэферэндуме: народ прагаласуе за ці супраць яе. Але мы ўжо бачым інфармацыйныя фэйкі на гэты конт і заклікі байкатаваць рэферэндум.

Я шмат кантактую з насельніцтвам, працоўнымі калектывамі, і яны звяртаюць увагу на тое, што ў Канстытуцыі павінна быць прапісана паняцце сям'і як саюза паміж мужчынам і жанчынай. Мы бачым, як спрабуюць у некаторых краінах навязаць непрымальную катэгорыю сям'і як аднаполага шлюбу. На адной з сустрэч, дзе збіраліся прапановы ў новую Канстытуцыю, моладзь прапанавала не толькі замацаваць паняцце шлюбу як саюза мужчыны і жанчыны, але і дадаць, што аднаполыя шлюбы забаронены.

Вартай прапановай з'яўляецца канстытуцыйнае замацаванне падтрымкі сем'яў, бо менавіта там выхоўваецца пачуццё патрыятызму.

Калі Канстытуцыя будзе прынята, на парламентарыяў ускладуць работу па ўкараненні навацый у заканадаўчую практыку. Але дэпутаты не хвалююцца, бо нарматворчая работа для нас паўсядзённая, значнай нагрузкі не заўважым. Падзаконныя акты, якія ў кампетэнцыі Палаты прадстаўнікоў, неабходна будзе ў адпаведнасці з Канстытуцыяй змяняць, дапаўняць ці нешта новае пісаць. Гэта ўсё будзе з удзелам грамадзян, бо любы законапраект абмяркоўваецца з зацікаўленымі коламі.

Марына ДАВЫДЗІК, намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама:

— Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь — адна з самых моцных у свеце. Таму вельмі важна, што застаецца аснова і захоўваюцца самыя галоўныя каштоўнасці і нормы: незалежнасць, суверэнітэт і сацыяльная скіраванасць. Але час патрабуе змяненняў. І дзяржава, улада гатовы да іх, прапаноўваючы новы праект Асноўнага Закона. А нам, грамадзянам, у сваю чаргу трэба прыйсці на рэферэндум, каб самым дэмакратычным шляхам выказаць уласную думку па тых змяненнях, якія выпрацаваны Канстытуцыйнай камісіяй. Унесена нямала важных

прапаноў. Хачу выказаць меркаванне па некаторых з іх.

У сацыяльнай дзяржаве забяспечваецца гарантаваная падтрымка і абарона грамадзян. У сваю чаргу і грамадзяне павінны праявіць сацыяльную адказнасць, удзельнічаць у стварэнні гэтых самых выгод. Такая папраўка прапаноўваецца ў артыкуле 21.

Лічу вельмі дарэчнымі змяненні ў артыкуле 32, дзе адзначаецца, што шлюб — гэта саюз мужчыны і жанчыны. Менавіта такі шлюб знаходзіцца пад аховай дзяржавы. Не варта прапагандаваць новыя на Захадзе саюзы двух мужчын альбо жанчын, якія называюць сябе сям'ёй альбо бацькамі пад нумарам адзін і два.

У Беларусі заўсёды з павагай і асаблівай увагай ставіліся да сталых і людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Стварэнне даступнага асяроддзя, інтэграцыя ў грамадства, праграмы падтрымкі, гарантыі — усё гэта ёсць у нашым грамадстве. На дадзеным этапе ў артыкуле 47 Канстытуцыі прапаноўваецца замацаваць роўныя магчымасці правоў і свабод пажылых людзей і інвалідаў. Раней у Асноўным Законе такога не было.

Зазначу яшчэ адзін немалаважны аспект. Правы і абавязкі за выхаванне дзяцей ляжаць на бацьках. А вось дзяржава садзейнічае духоўнаму і маральнаму, інтэлектуальнаму і фізічнаму развіццю моладзі. Для гэтага ствараюцца пэўныя ўмовы.

Сёння, як ніколі, наспела неабходнасць узмацнення патрыятычнага выхавання моладзі. Дзесяцігоддзі мірнага жыцця настолькі нас распаволілі, што фраза «каб толькі не было вайны» успрымецца маладым пакаленнем з іроніяй і нават сарказмам. Але свет непрадказальны і няўстойлівы. Таму, мяркую, варта прапагандаваць такія паняцці, як абавязак, гонар, адвага і адказнасць. Без гэтага можна страціць не толькі новыя пакаленні, але наогул і краіну. Лічу найважнейшымі змяненні, якія прапанаваны ў артыкуле 54: захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа як складнік патрыятычнага выхавання маладога пакалення. Праяўленне патрыятызму — гэта абавязак кожнага грамадзяніна. Бо Радзіму, як і маці, не выбіраюць. Яе мы павінны любіць як данасць, цаніць і аберагаць усімі сіламі.

Руслан АБРАМЧЫК, начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама:

— Шлюб — гэта саюз мужчыны і жанчыны. Ведаю, што ёсць ініцыятыва дадаць «па нараджэнні». Дапусцім, што дадалі. Абазначым мужчыну па нараджэнні як «М», жанчыну па нараджэнні як «Ж». Мужчыну па нараджэнні, які прайшоў працэдуру змены полу на жаночы, пазначым як «мЖ», а жанчыну па нараджэнні, якая прайшла працэдуру змены полу, — як «жМ». Пытанне: ці будзе задаволена жаданне заключыць шлюб паміж жанчынай па нараджэнні «жМ» і мужчынам па нараджэнні «М», калі фенатыпічна абодва выглядаюць як мужчыны? І, наадварот, саюз мужчыны па нараджэнні «мЖ» і жанчыны «Ж»?

Я супраць гэтай дабаўкі да фармулёўкі. У адным з артыкулаў прачытаў, што працэдуру змены полу за апошнія пяць гадоў прайшлі каля ста чалавек (адна сотая адной тысячнай насельніцтва). Прычыны зусім не рамантычныя і мала звязаныя з сексуальнай сферай — біялагічныя збоі пры дзяленні клетак чалавечага эмбрыёна прыводзяць да вельмі праблемных марфалагічных і гарманальных адхіленняў ад нормы. Дазвол на працэдуру падпісвае асабіста міністр аховы здароўя.

Ці трэба цягнуць у Асноўны Закон гендарную рыторыку пад выглядам барацьбы з ёй? Лічу, што не, раз мы гаворым аб захаванні традыцыйных каштоўнасцяў і іх абароне з дапамогай Канстытуцыі.

Святлана ПЛЕСКАЦЭВІЧ, намеснік начальніка аддзела сацыяльнай абароны адміністрацыі Маскоўскага раёна Брэста:

— Вельмі своечасовым і патрэбным лічу дапаўненне ў артыкул 47 Канстытуцыі нашай краіны, якое датычыцца роўных правоў і свабод для людзей з інваліднасцю. Многія з нас памятаюць тыя часы, калі інвалідаў амаль не было відаць на вуліцы, яны ў асноўным сядзелі дома. За апошнія дзесяцігоддзі ў краіне зроблена многа для сацыяльнай рэабілітацыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

У кожным раёне ёсць тэрытарыяльны цэнтр, спецыялісты якога працуюць з гэтай катэгорыяй насельніцтва. Асаблівая ўвага — маладым інвалідам, яны наведваюць тэрытарыяльныя цэнтры, займаюцца там па розных кірунках. Дзяржава стымулюе грамадскія арганізацыі працаваць з інвалідамі. Такіх прыкладаў нямала.

Інваліды цяпер маюць магчымасць атрымліваць адукацыю, уладкоўвацца на работу. Зроблены сапраўдны прарыў у безбар'ерным асяроддзі для людзей з інваліднасцю. Цяпер любы аб'ект здаецца з усім наборам прыстасаванняў для наведвання людзей з інваліднасцю. Прыкладам можа быць брэсцкі аўтавакзал, які не так даўно ўступіў у строй.

Іншымі словамі, дзяржавай рэалізоўваецца палітыка сацыяльнай інтэграцыі інвалідаў, стварэння даступнага асяроддзя і якасці жыцця. І гэта мы запісваем у адпаведны артыкул Канстытуцыі, такім чынам, замацоўваем набытак, які абумоўлены жыццём, а таксама абазначаем кірунак далейшага развіцця грамадства.

Запісалі Вольга АНУФРЫЕВА, Марыя ДАДАЛКА, Маргарыта УШКЕВІЧ, Святлана ЯСКЕВІЧ.

Калі ў вас з'явяцца меркаванні з нагоды праекта — пішыце ў рэдакцыю або непасрэдна ў арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі і прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая маецца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе: https://sbor.pravo.by; можна даслаць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1А, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».

НОВЫЯ ГАРЫЗОНТЫ

Пра тое, што зроблена за апошні час і што чакае Случчыну ў недалёкай будучыні, расказаў старшыня Слуцкага райвыканкама Андрэй ЯНЧЭЎСКІ

Слуцкі раён мае багатую і цікавую гісторыю. Сёння ён з'яўляецца адным з лідараў сельскагаспадарчай і перапрацоўчай вытворчасці ў Мінскай вобласці.

— Год быў сапраўды складаны, — кажа Андрэй Уладзіслававіч. Тым не менш, калі адзначаць вынікі эканамічнага развіцця, ён выдаўся для нас добрым. Раён выконвае ўсе чатыры асноўныя паказчыкі, якія нам былі даведзены. Гэта, у прыватнасці, узровень заробку, які на сёння склаў 1163 рублі ў сярэднім па раёне (114,7 % да мінулага года).

Інвестыцыі ў асноўны капітал перавысілі 100 %. Стабільна пералічваюцца даходы ў бюджэт. Экспарт складае 110 %, і гэта яшчэ не канчатковая лічба. Дадатнае сальда знешняга гандлю — 280 мільёнаў долараў ЗША. Для Слуцкага раёна гэта даволі важкі паказчык, своеасаблівы рэкорд для нас. Сукупны ўклад раёна ў скарбонку Мінскай вобласці складае па сельскай гаспадарцы прыкладна 10 %, а па прамысловасці — 8 %.

Нягледзячы на тое што надвор'е было сёлета не вельмі спрыяльным, мы сабралі годны ўраджай. Па валавым зборы збожжа мы занялі першае месца ў вобласці і другое ў краіне. Дарэчы, лідарамі па валавым зборы збожжавых культур у Мінскай вобласці мы з'яўляемся на працягу чатырох гадоў. Сабраны рэкордны ўраджай рапсу (каля 30 тысяч тон пры ўраджайнасці 32,3 ц/га). Мы недарэмна зрабілі стаўку менавіта на гэту культуру і не прагадалі, атрымаўшы важкі прыбытак.

Добрай была сёлета і ўраджайнасць ільнотрасты. Мы цвёрда ўтрымліваем першае месца ў вобласці па валавой вытворчасці малака. У краіне па гэтым паказчыку мы займаем трэцяе месца. Павялічылася вытворчасць мяса: як свініны, так і ялавічыны.

Усе гэтыя дасягненні дазваляюць нам паспяхова развіваць матэрыяльна-тэхнічную базу сельскагаспадарчых арганізацый. Тры гаспадаркі пры дапамозе абласнога выканаўчага камітэта пабудавалі новыя малочнатаварныя комплексы. Сёння туды завозяць жывёлу, і хутка гэтыя комплексы пачнуць дзейнічаць.

Прыемна, што 12 нашых найлепшых працаўнікоў атрымалі ўзнагароды на абласных «Дажынках». Гэта, безумоўна, радуе. Дарэчы, дэлегацыя Слуцкага раёна была на тым мерапрыемстве адной з найбуйнейшых.

— На якія рынкі накіроўваецца прадукцыя слуцкіх прадпрыемстваў?

— Мы актыўна дыверсіфікуем экспарт, асвойваем новыя рынкі збыту нашай прадукцыі. Напрыклад, значна пашырылі паставкі ў Кітайскую Народную Рэспубліку. Туды накіроўваецца прадукцыя нашых мясакамбіната, сыраробнага камбіната, сахарарафінаднага камбіната і некаторых іншых прадпрыемстваў. Хачу адзначыць, што 77 % нашага экспарту дае менавіта сыраробны камбінат — адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў дадзенага профілю ў рэгіёне. Дарэчы, яго сыравінная база складае ледзь не палову Мінскай вобласці.

Такія сельгаспрадпрыемствы Слуцкага раёна, як «Вясейскі Пакроў», «Казловічы-Агра», «Рачкавічы», аграфірма «Лучнікі», філіял сыраробнага камбіната, добра ведаюць за межамі Мінскай вобласці і нават краіны. Сёння яны актыўна развіваюцца, укараняюць новыя тэхналогіі, у прыватнасці рыхтуюцца значна пашырыць вытворчасць малака. Іх кіраўнікам я асабліва ўдзячны за дасягнутыя вытворчыя паказчыкі.

— А што ў апошні час зроблена для павышэння якасці жыцця насельніцтва Слуцкага раёна?

— Што датычыцца сацыяльнай сферы, то сітуацыя складваецца наступная: адпаведна з планам мы павінны пабудаваць 23 700 квадратных метраў жылля, і гэта заданне будзе выканана. На сённяшні дзень мы будуем чатыры шматкватэрныя дамы з усёй адпаведнай інфраструктурай. Значны крок зроблены і ў плане стварэння раёнаў індывідуальнай забудовы. Выканана поўнае добраўпарадкаванне двух такіх мікрараёнаў.

На працягу чатырох гадоў на Случчыне выконваецца даручэнне Прэзідэнта краіны аб паляпшэнні жыллёвых умоў шматдзетных сем'яў. На дадзены момант засталося каля 300 сем'яў, якія павінны атрымаць новае жыллё. Сёлета змаглі палепшыць умовы жылля 66 шматдзетных сем'яў.

— Жыллё ў раёне будуецца даволі актыўна. А ці паспявае за гэтым неабходная сацыяльная інфраструктура: школы, дзіцячыя сады, амбулаторыі?

— У раёне і ў самім Слуцку з забеспячэннем насельніцтва дашкольнымі дзіцячымі ўстановамі праблем няма.

Наколькі дазваляюць магчымасці, выконваем рамонт цэнтральнай раённай бальніцы. Хоць і па адным аддзяленні ў год, але справа не стаіць на месцы. Будзем вырашаць пытанне паступова, бо гэта адна з найважнейшых задач.

— Якой вы бачыце будучыню Слуцкага раёна?

— Лічу, што Слуцкі раён, як і сёння, застанецца адным з лідараў сельскагаспадарчай вытворчасці ў краіне. Будзе паступова развівацца яго перапрацоўчая галіна. Але мы плануем развіваць і такі напрамак дзейнасці, як турызм, у тым ліку і прамысловы. У нас ёсць некалькі прадпрыемстваў, дзе наведвальнікі маюць магчымасць не толькі азнаёміцца з сучасным вытворчым працэсам, але і пакаштаваць смачныя і арыгінальныя стравы. Адпаведныя планы ўжо ёсць. Не будзем забываць, што Слуцк — горад з багатай, старажытнай гісторыяй. Гэта таксама павінна прыцягваць шматлікіх гасцей. А яшчэ плануем пабудаваць агульнагарадскі цэнтр, дзе можна будзе займацца спортам альбо проста добра адпачываць. Плануецца далейшае добраўпарадкаванне горада, развіццё інфраструктуры. Упэўнены, што Слуцк стане яшчэ больш утульным і зручным для жыцця.

Хачу павіншаваць чытачоў газеты «Звязда» з надыходзячымі святамі. Жадаю, каб наступны год быў шчаслівым, багатым на добрыя падзеі, светлыя пачуцці, поспехі на карысць роднай Беларусі.

Сяргей РУЧАНАЎ.

РЫБНЫ ПРОМЫСЕЛ, ГАННЕНСКІ КІРМАШ...

Аб эксклюзіўных ініцыятывах расказаў старшыня Зэльвенскага райвыканкама Дзяніс АЛЬШЭЎСКІ

Калі коратка вызначыць асаблівасці раёна, яго ў першую чаргу можна назваць сельскагаспадарчым. Таксама ёсць ветрапарк і самы буйны ў Гродзенскай вобласці вадаём, які расцягнуўся ажно на дзевяць кіламетраў. Найбольш вядомы аб'ект — Сынкавіцкая царква-крэпасць, узрост якой — шэсць стагоддзяў. Але ёсць і яшчэ больш старадаўні помнік. Гэта геалагічная марэна, створаная ціскам ледніка 200 тысяч гадоў таму.

Фота аўтара.

Адсутнасць прамысловасці адбіваецца на населенасці: тут пражывае крыху больш за 14 тысяч чалавек — менш, чым ва ўсіх іншых раёнах вобласці. Каб не стрэчаць пазіцыі, трэба шукаць новыя магчымасці для развіцця. Малады кіраўнік Дзяніс АЛЬШЭЎСКІ, які ўзначальвае Зэльвенскі раён тры гады, у гутарцы вызначыў самыя значныя пункты росту.

— Дзяніс Аляксандравіч, якія галоўныя вынікі 2021 года?

— Год для нашага сельскагаспадарчага раёна быў даволі складаным з-за ўмоў надвор'я. Таму не ўдалося захаваць пазіцыі па намалоце збожжа — яго атрымалі крыху менш. І ўсё ж мы ў поўным аб'ёме забяспечылі нашу жывёлагадоўлю, выкананы поўнасцю дзяржзаказ.

Затое парадавала кукуруза. Намалот гэтай культуры склаў каля 30 тысяч тон, што ў тры разы больш за леташні. Гэта рэкорд для раёна. Створаны паўтарагадовы запас кармоў сенажу і сіласу, такога таксама раней не было. Кожная гаспадарка мае пэўны запас, нават можна падумаць аб продажы.

— Чаму так атрымалася?

— Тое, што перашкаджала збожжавым — ліўневыя дажджы — паспрыяла росту траў. Гэта датычыць і кукурузы. Такая ўжо спецыфіка сельскагаспадарчага года — ураджай адной культуры кампенсуе страты іншай. Таму баланс па валавым зборы захаваўся ў межах мінулагодняга.

— Новыя віды сельгаскультур асвойваеце?

— Вопыт паказвае, што выгадна вырошчваць кукурузу на зерне. Будзем на гэта рабіць акцэнт. Сёлета, напрыклад, мы атрымалі 105 цэнтнераў з гектара. Гэта добры вынік. З бягучага года мы пачалі практыкаваць сяўбу кукурузы са сланечнікам для кармавой базы, на другі год мяркуем вырошчваць сланечнік асобна, каб атрымаць алей, а галоўнае — макуху, якую мы купляем па высокай цане. Кожная гаспадарка будзе мець свой цэх.

— Я ведаю, што ў вас былі планы па рыбным промысле, які мяркуеце развіваць дзякуючы Зэльвенскаму вадасховішчу.

— Тут ёсць цэлая канцэпцыя. Адзін з напрамкаў — развядзенне рэдкіх відаў рыбы. У прыватнасці, залатога карася, вугра, мароны, судака. Навукоўцы Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта вывучаюць такую магчымасць. Цяпер тут водзяцца лешч, шчупак, плотка, акунь. Будзем чысціць рэчышча і запусцім белага амура і таўсталобіка, якія з'яўляюцца яшчэ і санітарамі вадаёмаў. Вядома, трэба рабіць усё асцярожна, каб не нашкодзіць новым відам рыбы.

Таксама ёсць намер задзейнічаць вадаём у турыстычных мэтах. У прыватнасці, стварыць назіральныя водныя пляцоўкі. Арганізаваць базу пракату лодак, катамаранаў, яхтаў, катараў. Спадзяёмся, што ўдасца знайсці гаспадара недабудаванаму санаторыю каля возера, гэта паскорыць турыстычны рух.

— Дзе сёння могуць размясціцца турысты, якія вырашаць адпачыць паблізу возера і хочуць больш камфортныя ўмовы, чым у палатках?

— У гарадскім пасёлку дзве гасцініцы. У нас штогод праходзіць каля дзесяці абласных рэспубліканскіх турніраў па рыбнай лоўлі, прыязджае шмат удзельнікаў. Яны маюць магчымасць размясціцца ў гасцініцах. Дарэчы, вы ведаеце, што ў сталічных рэстаранах нават гатуюць страву «шчупак па-зэльвенскі»? Рыба дастаўляецца менавіта адсюль, кажуць, што яна мае асаблівы смак.

— Сёлета адзначалася 300 гадоў з моманту заснавання камітэта Ганненскага кірмашу. Як плануеце ў далейшым развіваць дадзеную тэму?

— Ганненскі кірмаш і вадасховішча — пункты росту раёна. Напрыклад, на юбілейным кірмашы пабывала звыш пяці тысяч гасцей. Многія выказалі жаданне прыехаць налета і расказаць аб знакамітым фэсце сваім знаёмым, сябрам. За два дні было прададзена 2,5 тоны шашлыку, што для Зэльвы рэкорд. Упершыню паблізу Зэльвы раскінуўся горад рыцараў, дзе было нямала коннікаў. У гонар адраджэння Ганненскага кірмашу ў цэнтральным скверы ўстаноўлена скульптура каня. Распрацаваны і брэндбук з выявай каня, лагатып Ганненскага кірмашу будзе наносіцца на розную прадукцыю. Таксама ёсць аграсядзіба з магчымасцю катання на брычцы.

— Вы закранулі тэму маленькіх вёсак і тое, што насельніцтва змяншаецца. Зразумела, што трэба вырашаць і праблемы пустых дамоў. Як вы ведзяце такую работу?

— Апошнім часам работа ў гэтым плане актывізавалася. Аб'ёмы сапраўды даволі значныя, хоць знос патрабуе немалых сродкаў. Летась знеслі 130 такіх дамоў, сёлета — больш за сотню. Работу вядуць сельскія Саветы ў супрацоўніцтве з гаспадаркамі. Як правіла, акрамя зносу дома, участак трэба расчысціць ад хмызняку і бур'яну. Потым зямля пераходзіць пад пасяўныя плошчы.

— Ведаю пра ваш эксклюзіў — вясковыя музеі. Вы знайшлі вельмі цікавы спосаб вярнуць жыццё ў пустыя дамы, якія яшчэ нельга лічыць непрыдатнымі...

— Так, такія дамы не абавязкова зносіць, яны добра выглядаюць і могуць яшчэ доўга стаяць. Таму было вырашана стварыць у іх музей сельскага быту. Цяпер такія этнаграфічныя хаты-музеі ёсць у кожным сельскім Савеце Зэльвенскага раёна. Яны адлюстроўваюць асаблівасці тутэйшых вёсак. Трэба сказаць, што жыхары з радасцю адгукнуліся на прапанову: яны прыносілі рэчы, якія сведчылі аб гісторыі іх сем'яў. У такія музеі наведваюцца школьнікі як экскурсіямі, так і паасобку. Прыехаўшы да бабуль у вёску, дзеці абавязкова просяць, каб ім паказалі гэты музей. І многія ганарацца, што іх продкі нечым славіліся, здзейснілі вартыя памяці ўчынкі.

Таксама такія дамы выконваюць ролю клубаў — сюды месцічы могуць прыйсці, правесці нейкае мерапрыемства, пагутарыць, арганізаваць, напрыклад, сустрэчу за шклянкай чаю.

— Прадаць пустыя дамы ўдаецца?

— Пакуль мы толькі спрабуем гэтым займацца, бо перш чым прадаць, трэба прывесці ў парадак участак. Цяпер у нас недзе 100 дамоў, якія перададзены судом сельскім Саветам. Напрыклад, каля Зэльвенскага вадасховішча нямала малых вёсачак, дзе будзем спрабаваць пустыя дамы прадаць. Думаю, што яны будуць карыстацца попытам.

Заняліся добраўпарадкаваннем паркаў. Налета планаем прывесці ў парадак тры паркі. У адным з іх работы будуць весціся за кошт абласнога фонду грамадзянскіх ініцыятыў.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
г. п. Зэльва.

НЕМАГЧЫМЫХ ЦУДАЎ НЯМА

У гэтым запэўніў дзяцей старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН падчас галоўнага навагодняга свята Міншчыны. Ёлка ў рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» сабрала ў канцэртнай зале Палаца культуры ў Маладзечне больш як 400 дзяцей. «Кожны спадзяецца, што ў гэтыя дні спраўдзяцца яго самыя запаветныя жаданні, і важна сказаць, што немагчымых цудаў на свеце няма. Змяняюцца пакаленні, ідуць гады, але пераднавагоднія традыцыі застаюцца нязменнымі», — сказаў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна.

Госці Палаца культуры сталі ўдзельнікамі шматлікіх тэатралізаваных гісторый, гульняў і конкурсаў. На мерапрыемстве для дзяцей таксама ўладкавалі вялікія навагоднія фотазоны. На свяце працавала і ўнікальная «Зорная ёлка», якую арганізавалі для дзяцей, што апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Падтрымаць іх запрасілі вядомых асоб. Удзельнікі праекта размалявалі ёлачныя шары, пакінуўшы для хлопчыкаў і дзяўчынак навагоднія пажаданні і аўтографы. Усе аўтарскія ёлачныя цацкі з пажаданнямі, сувеніры і салодкія падарункі будуць перададзены ў Радашковіцкую школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

Завяршылася мерапрыемства ўручэннем удзельнікам свята навагодніх падарункаў.

Фота БелТА.

У КОЖНАГА ДЗІЦЯЦІ ПАВІННА БЫЦЬ СВЯТА

Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ наведаў дзяржаўную ўстанову «Дзіцячы дом-інтэрнат для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця».

Адразу пасля прыезду ў дом-інтэрнат мэр беларускай сталіцы азнаёміўся з умовамі пражывання дзяцей. Потым гасцей запрасілі на святочнае навагоднее прадстаўленне пад назвай «Добрая казка чароўнага ліхтара», арганізаванае супрацоўнікамі і выхаванцамі інтэрната. На сцэне акрамя Дзеда Мароза і Снягуркі прысутнічалі іншыя казачныя персанажы. А дзеці чыталі гледачам вершы і выконвалі танцавальныя нумары.

Пасля заканчэння святочнага прадстаўлення Уладзімір Кухараў ад імя кіраўніцтва гарвыканкама і адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска, на тэрыторыі якога знаходзіцца ўстанова, шчыра павіншаваў дзяцей з надыходзячым Новым годам і Калядамі. Усе выхаванцы дома-інтэрната атрымалі з рук гасцей салодкія навагоднія падарункі.

Трэба адзначыць, што на сёння ў доме-інтэрнаце пражываюць 100 дзяцей-інвалідаў з парушэннямі псіхафізічнага развіцця, з якіх 59 — тыя, хто застаўся без апекі бацькоў. Шасцёра дзетак — біялагічныя сіроты.

Выхаванцам інтэрната аказваецца комплекс сацыяльна-рэабілітацыйных паслуг з выкарыстаннем сучасных метадаў медыцынскага абслугоўвання, вывучэння, выхавання і рэабілітацыі. Тут працуе шэраг абсталяваных усім неабходным кабінетаў. Адукацыйны працэс ва ўстанове арганізаваны дыстанцыйна. Функцыянуе пяць спецыяльных класаў, дзе вучацца 33 вучні.

— У кожнага дзіцяці напярэдадні Новага года павінна быць свята, — адзначыў у сваім выступленні старшыня Мінгарвыканкама. — Усе дзеці загадваюць жаданні, і мы павінны зрабіць усё, каб мары спраўджваліся. Дзеці перад нашай сустрэчай добра падрыхтаваліся, паказалі нам цудоўнае прадстаўленне, а мы, адпаведна, павіншавалі іх і ўручылі падарункі. Трэба, каб кожнае дзіця не было абдзелена ўвагай, каб дзяцінства было вясёлае і светлае.

Кіраўніцтвам гарвыканкама запланавана яшчэ некалькі падобных мерапрыемстваў у кожным раёне сталіцы, і мы абавязкова іх правядзём. Сама акцыя ідзе ўжо два тыдні. Падрыхтавана 56 тысяч падарункаў, і сёння яны ўручаюцца дзецям, каб стварыць для кожнага свята, — падкрэсліў Уладзімір Кухараў.

Сяргей РУЧАНАЎ.
Фота аўтара.

«У НАС, ДАРОСЛЫХ, НЯМАЛА ПАДСТАЎ ВАМІ ГАНАРЫЦЦА»

Такой думкай падзяліўся старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА падчас абласной ёлкі. «Вам, дарагія работы, пашанцавала нарадзіцца і жыць у нашай цудоўнай Беларусі, — звярнуўся кіраўнік рэгіёна да юных гасцей у Палацы культуры вобласці. — У вас і вашых аднагодкаў ёсць усе магчымасці атрымаць добрую адукацыю, займацца творчасцю, спортам, рэалізаваць свае таленты. У нас мірная і спакойная краіна. Краіна, у якой кожны з вас можа быць крыху чараўніком. Трэба толькі старанна вучыцца, слухацца старэйшых, любіць сваіх блізкіх, сваю Радзіму, і тады ўсе вашыя добрыя мары абавязкова спраўдзяцца. Верце ў сябе і свае сілы».

Анатоль Ісачанка таксама адзначыў, што яму вельмі прыемна быць на такім казачным свяце і бачыць на тварах дзяцей шчаслівыя ўсмешкі. «У нас, дарослых, нямала падстаў вамі ганарыцца, — цытуе яго БелТА. — Вы паспяхова ўдзельнічаеце ў міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах, спаборніцтвах, алімпіядах. Вы разумныя і добрыя. Жадаю вам здзяйснення ўсіх жаданняў, каб ваша дарога ў жыццё была шырокай, светлай і шчаслівай».

Традыцыйная абласная ёлка сабрала каля 630 удзельнікаў з усяго рэгіёна. На свята прыехалі дзеці ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў, якія вызначыліся ў вучобе, творчых конкурсах, спартыўных спаборніцтвах — усе тыя, хто абараняе гонар установ адукацыі Магілёўскай вобласці на разнастайных спаборніцтвах і алімпіядах. Таксама на мерапрыемства запрошаны падлеткі, якія праяўляюць актыўную жыццёвую пазіцыю. Кожнага чакаў вялікі салодкі падарунак і захапляльны інтэрактыўны паказ «Каралеўства навагодніх казак», падрыхтаваны сіламі творчых калектываў Палаца культуры.

«Магілёўская вобласць багатая на таленты, таму што ў нас працуюць цудоўныя педагогі, — падзяліўся **начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама Андрэй ЗАБЛОЦКІ**. — Сёння на гэтым свяце сабраліся не ўсе найлепшыя дзеці нашага рэгіёна, іх значна больш. У нас усе цудоўныя, разумныя і адораныя. А наша задача — развіваць іх таленты і здольнасці».

ВАЖНА, КАБ МАРЫ ЗДЗЯЙСНЯЛІСЯ

Сямёра дзетак, якія выхоўваюцца ў дружнай сям'і Ірыны і Віталя Ашомкаў, атрымалі персанальныя падарункі ад Дзеда Мароза. Даставіў іх малым старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.

Сужэнцы выхоўваюць двух хлопчыкаў і пяць дзяўчынак, у тым ліку адну прыёмную. Малодшай Маргарыце толькі гадок, а старэйшая Таццяна вучыцца ў медыцынскім каледжы. Спартыўнай гімнастыкай займаецца сямікласніца Карына, а Ягор, які ў дзявятым, ужо мае пэўныя дасягненні ў вольнай барацьбе. На брата раўняецца першакласнік Захар. Пры гэтым хлопчык паведамляе, што любіць матэматыку. Другакласніца Насця і выхаванка ясляў-сада Сафія імкнуцца дапамагаць бацькам ва ўсіх хатніх справах. Яшчэ ў сям'і ёсць чатыры пушыстыя гадаванцы: тры каты і нямецкая аўчарка.

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван Крупко перадаў падарункі для шматдзетнай сям'і АШОМКАЎ.

Маці Ірына працуе прыёмным бацькам аддзела адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Цэнтральнага раёна абласнога цэнтра. Тата Віталь — кіроўца ў Гомельскім гарадскім спецыялізаваным аўтападпрыемстве па ўтрыманні дарог. У сям'і шмат агульных захапленняў. Напрыклад, перад Новым годам усе разам упрыгожваюць ёлку і пішуць лісты Дзеду Марозу. Летась Ірына Ашомка была ўзнагароджана ордэнам Маці. Жанчына ўпэўненая, што ў кожнай сям'і ёсць свой сакрэт шчасця.

— Наш сакрэт просты: муж з жонкай павінны падтрымліваць адно аднаго, каб былі паразуменне і агульныя інтарэсы. Дзяцей імкнёмся ў першую чаргу навучыць, каб яны былі добрымі, сумленнымі і працавітымі, — кажа яна.

Малыя распавялі кіраўніку рэгіёна пра свае мары, захапленні і поспехі. Ад Івана Крупко яны атрымалі падарункі.

— Вельмі эмацыянальныя дзеці, душэўныя бацькі, — заўважыў Іван Іванавіч. — Рады за дарослых — яны робяць шчаслівымі не толькі сваіх дзяцей, але і прыёмнага. Рашыцца на такі крок могуць толькі адказныя людзі з вялікім і добрым сэрцам. Усе мы — і дзеці, і дарослыя — чакаем навагодняга цуду. Важна, каб кожнае дзіця атрымала шчырыя эмоцыі ад свята, адчуванне чараўніцтва. Мы, дарослыя, павінны рабіць усё, каб мары здзяйсняліся, каб у дзяцей былі шчаслівыя вочы. Дзецям трэба дарыць казку не раз на год, а часцей, бо яны вырастуць і прымуць гэту эстафету дабра.

Іван Крупко пажадаў сям'і моцнага здароўя, міру ў доме і ва ўсёй краіне.

— Я думаю, што ў 2022 годзе ўсё ў нас атрымаецца, калі мы будзем разам, — дадаў старшыня аблвыканкама.

Між тым падарункі дзецям гамяльчанкі Антаніны Грэсь напярэдадні асабіста перадаў **Памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Гомельскай вобласці Мікалай РАГАШЧУК.**

Жанчына адна выхоўвае траіх дзяцей. Пяцікласнік Ілья захапляецца матэматыкай і фізкультурай, а яго брат, першакласнік Данііл, з запалам асвойвае дакладныя навукі. Трохгадовая Вераніка марыць стаць балерынай. Дзеці агучылі свае планы Мікалаю Рагашчуку, які пажадаў сям'і ўсяго найлепшага ў новым годзе.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Ноткі смаку з Навагрудка

Сёння «Навагрудскія Дары» — адно з прадпрыемстваў галіны, што найбольш дынамічна развіваюцца, і адно з вядучых вытворцаў натуральнай малочнай прадукцыі на тэрыторыі Гродзенскай вобласці.

Асноўнымі кірункамі дзейнасці прадпрыемства з'яўляюцца вытворчасць і рэалізацыя сыроў паўцвёрдых, масла, сухіх малочных прадуктаў, натуральнай малочнай прадукцыі, казеіну тэхнічнага, ЗНМ.

Сёння пад брэндам **«Навагрудскія Дары»** выпускаецца больш чым 60 найменняў прадукцыі: паўцвёрдыя, цвёрдыя, мяккія і расольныя сыры, натуральная малочная прадукцыя, сухія малочныя прадукты, салодка-сметанковае масла, тэхнічны казеін, заменнік натуральнага і абястлушчанага малака. Маючы такую разнастайную лінейку, прадпрыемству лягчэй манеўраваць ва ўмовах попыту, які пастаянна мяняецца.

Прадпрыемства цвёрда замацавалася на рынках — як на ўнутраным, так і на знешніх — і цяпер з'яўляецца экспартна арыентаваным. Удзельная вага экспарту ў агульным аб'ёме рэалізаванай прадукцыі складае больш за 90 працэнтаў.

Сёлета праведзена мадэрнізацыя ўчастка вытворчасці казеіну ў Карэліцкім сырцэху. Чаму менавіта казеін? На яго ёсць добры попыт і на ўнутраным рынку, і за мяжой, а канкурэнцыя ў межах нашай краіны нешматлікая. Ёсць вопыт вытворчасці гэтага каштоўнага прадукту, напрацаваны сувязі са спажыўцамі ў Расіі і краінах ЕС — Польшчы, Літве, Германіі, Нідэрландах. Рынкавая кан'юнктура складваецца спрыяльна, таму гэтыя інвестыцыі апраўданыя і своечасовыя.

Сапраўднай візіткай прадпрыемства з'яўляюцца паўцвёрдыя, цвёрдыя і звышцвёрдыя сыры, асартымент якіх налічвае больш за 20 відаў, пры гэтым спецыялістамі прадпрыемства вядзецца работа па яго пашырэнні.

Ад усёй душы віншуем вас з Новым годам!

Новы год — свята асаблівае: дорыць надзею на шчасце і ўдачу, нясе радасць новых пачынанняў. Сёлетні год быў насычаны важнымі падзеямі і здзяйсненнямі.

У надыходзячым годзе жадаем моцнага здароўя, шчасця, душэўнай стойкасці, упэўненасці ў сілах і аптымізму. Няхай заўсёды побач будуць родныя і сябры, а ў вашых дамах пануюць дабрабыт, любоў і працвітанне.

Асаблівая гордасць навагрудскіх сыраробаў — звышцвёрды **«Рэджаніта»** — сапраўдны вытрыманы сыр з насычаным саладкавата-рэзкім смакам, вельмі цвёрды па структуры, які і належыць вытрыманаму сыру. У сляпых дэгустацыях ён неаднаразова безагаворачна выйграваў у еўрапейскіх аналагаў.

Калектыў прадпрыемства прыкладае ўсе намаганні, каб ісці ў нагу з часам і пастаянна радаваць свайго пакупніка навінкамі.

Прадукцыя гандлёвай маркі **«Навагрудскія Дары»** карыстаецца заслужаным попытам і папулярнасцю. Для спажыўцоў гэтая марка ўжо даўно з'яўляецца сінонімам якасных, а галоўнае, натуральных прадуктаў. А дзелавая рэпутацыя кампаніі як надзейнага партнёра спрыяе актыўнаму ўзаемадзеянню са шматлікімі айчыннымі і замежнымі вытворцамі.

Прадпрыемства глядзіць у будучыню з аптымізмам і новымі задумамі.

Сяргей КУРКАЧ.

УНП 500843255

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСККОНТРАКТ» (Продавец)

ЛОТ № 1: ЛЕГКОВОЙ СЕДАН AUDI A6,
кузов (рама) № WAUZZZ4G6CN030598, 2011 г. в.

Начальная цена с НДС – 30 138,00 руб.
Задаток – 3 013,80 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Местонахождение: Минская область, Минский район, пос. Сухорукие, ул. Базовская, 1А.

Аукцион состоится 31.01.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **27.01.2022 в 11.00**.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) информирует о проведении открытого по продаже права заключения договора аренды изолированного помещения с инв. № 350/D-351610 (помещение неустановленного назначения), находящегося в республиканской собственности и переданного в безвозмездное пользование Открытому акционерному обществу «Электрооаппаратура»
Дата проведения аукциона: 19 января 2022 г. в 10.00
Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1.

№ лота	Наименование объекта аренды, цель его использования	Арендуемая площадь (м²)
1	**Изолированное помещение неустановленного назначения, инв. № 350/D-315610.** (Розничная торговля непродовольственными товарами)	**39,2**

Местонахождение объекта аренды: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Телегина, 23-3

Начальная цена продажи права заключения договора аренды: 165,62 руб. Задаток: 165,62 рубля. Коэффициент к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду составляет **1,3. Срок договора аренды: 5 лет, начиная со дня заключения договора аренды. Шаг аукциона: 5 %**

Местонахождение организатора аукциона, его контакты:
г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47, 32-18-95, 8 (029) 170-46-47, сайт: www.gino.by, e-mail: gomel@ino.by

Извещение о проведении аукциона опубликовано 29.12.2021 г. на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте Организатора торгов gino.by

УНП 401166490

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **УП «Комбинат декоративно-прикладного искусства им. А.М. Кищенко»** (УНП 600126458) 222520, г. Борисов, ул. Блюхера, 19, тел. 8 033 688 86 54, в лице ликвидатора ООО «Правовая компания «Делегат».

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **14 января 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Художественная мастерская 610/с-26438, инв. № 01-016, общ. пл. 200,6 кв. м, г. Борисов, пр-т Революции, 42А	70 815,60
2	Художественные мастерские 610/с-26415, инв. № 01-004, гостиница инв. № 01-0016 – общ. пл. 459,8 кв. м, г. Борисов, пр-т Революции, 42Б	162 875,88
3	Шкаф сушильный № 1, инв. № 197	80,00
4	Шкаф сушильный № 11, инв. № 392	80,00
5	Шкаф сушильный № 13, инв. № 259	80,00
6	Шкаф сушильный № 14, инв. № 259-3	80,00
7	Шкаф сушильный № 15, инв. № 259-1	80,00
8	Шкаф сушильный № 16, инв. № 259-2	80,00
9	Шкаф сушильный № 2, инв. № 198	80,00
10	Шкаф сушильный № 3, инв. № 204	80,00
11	Шкаф сушильный № 4, инв. № 258	80,00
12	Мельница барабанная № 1, инв. № 366	480,00
13	Мельница барабанная № 2, инв. № 334	350,00
14	Мельница барабанная № 3, инв. № 295	350,00
15	Станок гончарный, инв. № 191	120,00
16	Станок гончарный, инв. № 192	120,00
17	Станок гончарный, инв. № 192-1	120,00
18	Станок гончарный, инв. № 192-2	120,00
19	Станок гончарный, инв. № 192-3	120,00
20	Промышленная швейная машина Global ZZ 217-3S (Голландия), инв. № 606	900,00

Телефон для ознакомления и осмотра +37529-698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 01.01.2022 г. 09.00 по 13.01.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 01.12.2021 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский мясокомбинат № 1» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

ПРОЦЕССА-АВТОМАТА FV175-200 (с подъемником HV 200),

2018 года выпуска, инв. № 10318, предназначенного для производства продуктов низкой вязкости (паштетов, вареной колбасы, плавленого и молодого сыров, сурими, майонеза, детского питания, деликатесов и соусов), изготовитель – Германия. Объект находится по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Демина, 8.

Начальная цена с НДС (20 %) – **369 600,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **36 960,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **31.01.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.01.2022** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, сайт в сети интернет: www.rlt.by.

УНН 691921136

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды нежилого помещения № 17 в административно-хозяйственном здании, находящемся в собственности Республики Беларусь и закрепленном за РУП «Институт недвижимости и оценки» на праве хозяйственного ведения
Дата проведения аукциона: 19 января 2022 г. в 11.00
Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1.

№ лота	Наименование объекта аренды, цель его использования	Арендуемая площадь (м²)
1	**Нежилое помещение № 17 в правом крыле 1-го этажа здания административно-хозяйственного с инв. № 350/С-56805** (для размещения офиса)	**18,8**

Местонахождение объекта аренды: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Артема, 23, пом. 17

Начальная цена продажи права заключения договора аренды: 79,43 рубля. Задаток: 79,43 рубля. Коэффициент к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду составляет **2,5. Срок договора аренды: 5 лет, начиная со дня заключения договора аренды. Шаг аукциона: 5 %**

Местонахождение организатора аукциона, его контакты:
г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47, 32-18-95, 8 (029) 170-46-47, сайт: www.gino.by, e-mail: gomel@ino.by

Извещение о проведении аукциона опубликовано 29.12.2021 г. на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте Организатора торгов gino.by

УНП 401166490

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
30 снежня 2021 г. № 51 (636)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

АКЦЫЯ «НАШЫ ДЗЕЦІ»

Наталля КАЧАНАВА:

«УСЕ ДЗЕЦІ ЖАДАНЫЯ Ў НАШАЙ РОДНАЙ КРАІНЕ»

СПІКЕР верхняй палаты парламента Наталля Качанава ў рамках акцыі «Нашы дзеці» павіншавала выхаванцаў цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Полацкага раёна з надыходзячымі святамі і падарыла сертыфікат на тэлевізар.

Традыцыйная акцыя «Нашы дзеці», распачатая па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы яшчэ чвэрць стагоддзя таму, працягвае збіраць шчаслівыя ўсмешкі дзяцей па ўсёй Беларусі. На мінулым тыдні Старшыня Савета Рэспублікі завітала ў РНПЦ дзіцячай анкалогіі і гематалогіі, дзе павіншавала малых і калектыў установы аховы здароўя з надыходзячымі святамі, сёння — у Полацкі цэнтр, выхаванцы якога таксама патрабуюць павышанай увагі з боку дзяржавы.

Дарэчы, цяпер у цэнтры выхоўваюцца 84 дзіцяці ва ўзросце да 18 гадоў, у іх ёсць цяжкія шматлікія парушэнні ў развіцці. Тут арганізавана работа па ранняй комплекснай дапамозе дзецям да трох гадоў. Хлопчыкі і дзяўчынкі вучацца ў трох дашкольных групах і чатырох спецыяльных класах. Вучэбны працэс пабудаваны па адмысловай праграме. Асноўну акцэнт робіцца на сацыялізацыю дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

На сённяшнім святе госці з задавальненнем разам з дзецьмі паўдзельнічалі ў конкурсах і выпрабаваннях. Разам з героямі спектакля яны адгадвалі загадкі каварнага Грынча, шукалі нумар тэлефона Дзеда Мароза, а затым дапамагалі зімоваму чараўніку і яго ўнучцы Снягурцы запаліць агні на навагодняй ёлцы.

— Гэта свята неабходна, бясспрэчна, нашым дзецям, але патрэбна і нам, — падкрэсліла пасля спектакля Наталля Качанава. — У такія імгненні мы можам у поўнай меры адчуць сябе шчаслівымі, таму што мы побач з дзецьмі. Я кожны раз атрымліваю зарад энергіі, калі сустракаюся з хлопчыкамі і дзяўчынкамі.

Да марафону добрых спраў далучылася і мясцовая ўлада. Старшыня Полацкага райвыканкама Ігар Марковіч уручыў карэкцыйнаму цэнтру сертыфікат на тры тысячы рублёў. Гэтыя грошы накіруюць на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы адукацыі.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота БелТА.

У тэму

Спікер верхняй палаты парламента пабывала таксама ў сацыяльна-педагагічным цэнтры з прытулкам Ленінскага раёна сталіцы.

— Гэта цудоўная акцыя — «Нашы дзеці», калі мы разам сустракаемся напярэдадні выдатнага свята — Новага года, можам сказаць ім добрыя словы, пачуць іх пажаданні і віншаванні, — адзначыла ў гутарцы з журналістамі Старшыня Савета Рэспублікі.

Яна расказала, што заўсёды з велізарнай радасцю наведвае такія дзіцячыя ўстановы, бо вельмі любіць дзяцей, і падкрэслівае: яны — наша будучыня.

— Вельмі хацелася б, каб жаданні дзяцей спраўджваліся, таму што яны самыя простыя: быць з сям'ёй, быць здаровымі, — кажа спікер. — Хай бы ў нашай краіне ўсе дзеці былі ў сем'ях, былі жаданымі так, як яны жаданыя для нашай роднай краіны.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу, што ў Беларусі робіцца ўсё для таго, каб дзецям жылося камфортна, утульна, каб яны любілі нашу Беларусь, але пра гэта павінны думаць і іх родныя, людзі, якія знаходзяцца побач з імі.

— Таму з вялікай радасцю і павагай мы ставімся да ўсіх педагогаў, якія працуюць у дашкольных установах, сацыяльна-педагагічных цэнтрах, установах дадатковай адукацыі, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Гэтыя творчыя, добрыя людзі, тыя, хто сапраўды любіць дзяцей і аддае часцінку свайго сэрца і душы ім, — гэта вельмі важна.

Спікер падкрэсліла: дзякуючы такім людзям у нашай краіне няма дзяцей, якія б апынуліся ў складанай сітуацыі і не змаглі знайсці падтрымку і дапамогу. Таксама спікер нагадала аб неабходнасці заўсёды памятаць: побач з табой ёсць тыя, хто мае патрэбу ў тваёй дабрыні і клопаце. Яна звярнула ўвагу, што менавіта на гэта і накіравана акцыя «Нашы дзеці».

Разам з віншаваннямі і пажаданнямі Старшыня Савета Рэспублікі перадала ўстанове сертыфікат на набыццё пральнай машыны. Дзеці атрымалі салодкія падарункі, госці — сувеніры, зробленыя малымі ўласнаручна.

НА ПАРАДКУ ДНЯ

Да юбілею святыні

Варыянт падтрымкі Полацкаму жаночаму манастыру будзе знойдзены



ДЗЯРЖСАКРАТАР Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ паабяцаў падчас рабочай сустрэчы са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ, якая адбылася на пачатку тыдня ў Полацку, аказаць дапамогу ва ўладкаванні аб'ектаў для паломнікаў. Гаворка, у прыватнасці, датычылася будаўніцтва трапезнай і гасцініцы манастыра.

Нагадаем, што ў 2025 годзе Спаса-Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр адзначыць юбілей — сваё 900-годдзе. Ужо зараз усе нераўнадушныя да гэтай падзеі задумваюцца аб пасільнай дапамозе манастыру з гэтай нагоды. Адной з тэм абмеркавання падчас рабочай сустрэчы Наталлі Качанавай з Дзмітрыем Мезенцавым і стаў удзел свецкай улады ў тым, каб знакавая дата гэтай мясціны прайшла на найвышэйшым узроўні.

У прыватнасці, адным з клопатаў манастыра з'яўляецца недахоп месцаў для ўсіх, хто жадае наведаць святое месца, а таму гэта павінна быць уладкаванне трапезнай і вялікай гасцініцы для паломнікаў. Сюды едуць тысячы турыстаў з Беларусі і замежжа, і пытанне з іх пасяленнем становіцца вельмі балючым.

Як паведаміў Дзмітрый Мезенцаў, пакуль канкрэтных праектаў з Саюзнай дзяржавай па гэтым кірунку няма, але першыя крокі на шляху супрацоўніцтва ўжо зроблены.

— Мы самым дбайным чынам вывучым усе высновы, якія даюць рэстаўратары, архітэктары, тыя, хто сёння працуе над захаваннем унікальнай спадчыны, якая захоўвалася стагоддзямі і нам падорана. І дакладна акажам дапамогу. Варыянт сістэмнай падтрымкі гэтага месца павінен быць знойдзены, — падкрэсліў дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы.

Паводле яго слоў, гэтыя мясціны ён наведаў упершыню, і яму, як чалавеку ўцаркоўленаму, вельмі ганарова пабываць у такім святым месцы, дакрануцца да мошчаў прападобнай Еўфрасінні Полацкай. Дзяржсакратар спадзяецца апынуцца тут яшчэ раз, каб пазнаёміць з адным з найстарэйшых праваслаўных манастыроў сваю сям'ю.

Акрамя таго, госці сёння таксама пабывалі ў Сафійскім саборы і Полацкім дзяржаўным ўніверсітэце.

НА СУВЯЗІ!

На прыём да сенатара

У аўторак, 4 студзеня, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.

Прыём будзе весціся з 10.00 да 13.00 па адрасе: Мінск, вуліца Кірава, 47.

Адзначым, што патрэбны папярэдні запіс. Зрабіць гэта можна, накіраваўшы ў Савет Рэспублікі зварот пісьмовы (220016, г. Мінск, Чырвонаармейская, 9) або электронны (форма для запаўнення размешчана на сайце http://sovrep.gov.by/ru/el_obr/).

Калі ўзніклі пытанні, тэлефануйце: 8 (017) 327 27 09, 327 46 74.

Вольга АНУФРЫЕВА.

СІМВАЛ БЕСКАРЫСЛІВАСЦІ І ЯДНАННЯ

Сенатары прынялі актыўны ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці»

Кнігі, канструктары, спартыўны інвентар, цёплыя коўдры, медыцынскае абсталяванне і, безумоўна, салодкія падарункі. Чым парадавалі дзяцей члены Савета Рэспублікі гэтымі днямі, наведваючы ўстановы аховы здароўя і адукацыі ў рамках акцыі «Нашы дзеці».

Гаворачы аб гэтым свяце, **спікер Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** падкрэсліла: яно патрэбна не толькі малым, але і дарослым:

— Гэтае свята патрэбна нашым дзецям, несумненна, але яно патрэбна і нам, таму што мы ў поўнай меры можам адчуць сябе ў гэтыя моманты шчаслівымі людзьмі, мы побач з нашымі дзецьмі, дзе б яны ні знаходзіліся па ўсёй краіне.

Днямі **віцэ-спікер верхняй палаты парламента Леанід ЗАЯЦ і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ** наведаў Сенненскі дзіцячы дом, што на Віцебшчыне.

— Заўсёды вельмі прыемна быць удзельнікамі марафону дабра пад назвай «Нашы дзеці». Гэтая традыцыя, ініцыіраваная Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, доўжыцца ў краіне ўжо больш за чвэрць стагоддзя і з кожным годам становіцца ўсё больш маштабнай. Яна дорыць чароўныя эмоцыі ўсім удзельнікам. Для нас, дарослых, гэта асабліва важна, бо ўся каштоўнасць жыцця ў дзецях, а іх шчаслівыя вочы і ўсмешкі — сэнс і стымул для новых добрых здзяйсненняў, — адзначыў віцэ-спікер Савета Рэспублікі.

Трэба сказаць, што ў Беларусі клопат аб дзецях заўсёды на першым месцы. Асабліва гэта датычыцца дзяцей, якія па волі лёсу апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі. Дзяржава забяспечвае выхаванцаў усім неабходным для жыцця і развіцця. Але чалавечай увагі ім патрабуецца больш, каб яны не адчувалі сябе абдзеленымі.

Парламентарыі азнаёміліся з дзейнасцю дзіцячай установы адукацыі і ўмовамі жыцця выхаванцаў, выказалі словы падзякі педагогам за іх высакародную працу па падтрымцы падрастаючага пакалення з нялёгкім жыццёвым лёсам.

Неад'емнай часткай і яркім завяршэннем свята сталі падарункі, уручаныя сенатарамі дзецям і дзіцячаму дому.

— Гэты момант прыносіць дарослым радасці не менш, чым дзецям, — падкрэсліў Леанід Заяц.

Член Савета Рэспублікі **Каліна КАПУЦКАЯ** завітала ў цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі ў Маладзечне. Гэта асабліва ўстанова, дзе працуюць людзі, якія любяць дзяцей і адданыя сваёй прафесіі. Сёння тут праходзяць навучанне і рэабілітацыю 155 выхаванцаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Работнікі ўстановы сумесна з выхаванцамі падрыхтавалі святочную праграму «Навагодняя казка».

Сенатар падарыла цэнтру развіццёвыя гульні і павіншавала ўсіх з надыходзячым Новым годам.

— Дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» — адзін з сімвалаў бескарыслівасці і яднання людзей у сучаснай гісторыі Беларусі. Дарыць дабро проста, галоўнае — мець жаданне. Кожнае дзіця, адчуўшы добрае стаўленне да сабе, вырасце неабыякавым і клапатлівым. Вельмі важна паказваць нашым дзецям, што дарослыя іх любяць, цэняць і паважаюць, — адзначыла парламентарый.

Па яе ініцыятыве таксама ў рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» на базе сярэдняй школы № 14 Маладзечна, дзе сенатар працуе дырэктарам, адбылося тэатралізаванае прадстаўленне «Навагодняя казка», арганізаванае валанцёрскім атрадам «Добрае сэрца». Гасцямі свята сталі дзеці-інваліды з парушэннем слыху і іх бацькі — члены грамадскага аб'яднання «Камертон».

Парламентарый павіншавала прысутных з навагоднімі святамі і пажадала здзяйснення жаданняў, здароўя і поспехаў у новым годзе. Кожны ўдзельнік урачыстасці атрымаў падарункі ад Беларускага фонду міру і ўстановы адукацыі.

Сенатар **Анатоль ШАЛТАНЮК** наведаў Падлескі дзіцячы сад — пачатковую школу, дзе павіншаваў выхаванцаў і педагогаў з надыходзячым Новым годам і Калядамі, уручыў салодкія падарункі і фрукты, а таксама перадаў сертыфікат на набыццё пральнай машыны.

Ала СМАЛЯК прыняла ўдзел у акцыі «З любоўю да дзяцей», якая прайшла ў гематалагічным аддзяленні РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека.

Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, дэпутацкага корпуса і кіраўніцтва Навабеліцкага раёна Гомельскай вобласці адрасавалі юным пацыентам установы аховы здароўя найлепшыя пажаданні і перадалі навагоднія падарункі.

— Новы год — час чараўніцтва. І трэба зрабіць усё магчымае, каб дзеці, якія па розных прычынах сустракаюць святы не ў родным доме, змаглі ў поўнай меры адчуць казачную атмасферу, — падкрэсліла сенатар.

Аляксей КУШНАРЭНКА завітаў у РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі, дзе павіншаваў маленькіх пацыентаў з навагоднімі святамі.

Сенатар ад імя Міністэрства энергетыкі перадаў кіраўніку медыцынскай установы Анжаліцы Сонцавай сертыфікат на набыццё крыяхірургічнай афтальмалагічнай сістэмы, а таксама падарункі для дзяцей, якія праходзяць лячэнне ў цэнтры.

Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ прывітаў юных удзельнікаў урачыстай праграмы ў Палацы культуры ААТ «Нафтан» у Наваполацку. Парламентарый выказаў удзячнасць усім арганізатарам акцыі за тое, што праяўляюць увагу да маленькіх беларусаў, дораць ім клопат і любоў, а таксама пажадаў усім здароўя, шчасця, міру і дабрабыту.

Фелікс ЯШКАЎ сумесна з работнікамі Гомельскай мытні і Гомельскім філіялам РУП «Белмытсэрвіс» наведалі Нараўлянскі і Лельчыцкі сацыяльна-педагагічныя цэнтры. Выхаванцам падарылі спартыўны інвентар, цёплыя коўдры і прысмакі.

— Новы год — чароўны час, калі ўсе жаданні павінны здзяйсняцца, асабліва дзіцячыя. Неабходна як мага больш удзяляць увагі дзецям, дапамагаць ім. Гэта нескладана, бо ў адказ яны дораць шчырыя эмоцыі, пачуцці і ўсмешкі, — адзначыў сенатар.

Алег СЛІНЬКО пабываў у Жыткавіцкім сацыяльна-педагагічным цэнтры, выхаванцы якога — дзеці з сацыяльна небяспечных сем'яў, якія засталіся без апекі бацькоў. Малыя, пазбаўленыя мацярынскага цяпла і клопату, асабліва маюць патрэбу ва ўвазе, у часцінцы радасці, любові і дабра тых, хто іх акружае і ўсяляе надзею і веру ў лепшае.

Парламентарый павіншаваў дзяцей і педагогаў з надыходзячым Новым годам, уручыў дзецям салодкія падарункі і пажадаў моцнага здароўя, поспехаў у вучобе, добрых, верных сяброў, навагодніх цудаў, выканання запаветных жаданняў.

— Напярэдадні самага доўгачаканага і чароўнага свята — Новага года — ні адно дзіця не павінна заставацца без падтрымкі, клопату і ўвагі. Акцыя «Нашы дзеці» — найлепшае сведчанне аднадушнага аб'яднання дзяржавы і грамадства ў вырашэнні гэтай задачы, — адзначыў Алег Слінько.

Валерый ПАЛІШЧУК завітаў у Мацюцкі яслі-сад Горацкага раёна, што на Магілёўшчыне.

— Новы год, несумненна, — самае дзіцячае свята, таму што дзеці больш за ўсіх чакаюць здзяйснення жаданняў, падарункаў, вераць у чараўніцтва і, вядома ж, у Дзеда Мароза, — кажа ён.

Курсанты і супрацоўнікі Магілёўскага інстытута МУС падрыхтавалі для дзяцей навагодні тэатралізаваны паказ «Снежная каралева», уручылі салодкія падарункі з пажаданнямі каляднага цуду, сіл, дабра і здароўя.

Сенатар перадаў адміністрацыі ясляў-сада аб'ёмныя канструктары для дзяцей.

А вось **Анатоль ШЧАСНЫ** пабываў на святе ва ўстанове аховы здароўя «Віцебскі абласны спецыялізаваны Дом дзіцяці». Парламентарый разам са студэнцкім актывам павіншаваў выхаванцаў і адміністрацыю ўстановы з надыходзячым Новым годам і ўручыў ад студэнтаў медыцынскага ўніверсітэта сертыфікат на суму 3700 беларускіх рублёў.

Таццяна ПАЛУШКІНА наведала базавую школу № 12 імя Аляксеева ў Полацку, дзе павіншавала дзяцей, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, з надыходзячымі святамі. Школьнікі атрымалі прысмакі, канцылярскія прылады і кнігі.

Па ініцыятыве і падтрымцы **Таццяны АБЕЛЬ** на базе Палаца культуры «Касцюкоўка» адбыліся навагоднія паказы. Гасцямі свята сталі дзеці з Веткаўскага і Добрушскага раённых сацыяльна-педагагічных цэнтраў, а таксама выхаванцы Торфазаводскага ясляў-сада Гомельскага раёна. За два дні ў мерапрыемствах прыняло ўдзел каля 50 дзяцей.

— У Беларусі чужых дзяцей няма, і пра гэта сведчыць назва дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці». Радуе, што сёння нам удалося падарыць дзецям усмешкі і добры настрой. Любы дарослы разумее, наколькі гэта важна. І асабліва напярэдадні Новага года. Такія мерапрыемствы адыгрываюць ключавую ролю ў жыцці малых, бо ад іх выхавання шмат у чым залежыць наша будучыня і будучыня нашай краіны, — пераканана Таццяна Абель.

Васіль МАРКЕВІЧ прыняў удзел у мерапрыемстве ў Гарадзішчанскім доме-інтэрнаце для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Сенатар павіншаваў дзяцей з надыходзячым Новым годам і ўручыў падарункі.

Таксама парламентарый арганізаваў тэатралізаванае віншаванне і перадаў каштоўныя падарункі для выхаванцаў цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Баранавіцкага раёна і сацыяльна-педагагічнага цэнтра Баранавічаў.

Тамара ШАТЛІКАВА пабывала на святе ў цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Дзеці вельмі чакалі гасцей і падрыхтавалі для іх навагоднее тэатралізаванае прадстаўленне. Парламентарый павіншавала ўсіх прысутных з надыходзячым Новым годам і ўручыла выхаванцам салодкія падарункі, а цэнтру перадала спецыяльнае абсталяванне — раскладныя крэслы-парты для дзяцей з асаблівасцямі фізічнага развіцця.

Падрыхтавала Вольга АНУФРЫЕВА.

ЭСТАФЕТА СВЯТОЧНАГА НАСТРОЮ

У навагоднія дні радыёстанцыі Белтэлерадыёкампаніі падрыхтавалі слухачам шэраг творчых праектаў, віншаванняў, прызоў і адметнае музычнае напаўненне.

Вынікі года па традыцыі 31 снежня падвядуць у «Радыёфакце» на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. Абмеркаванне знакавых падзей журналісты зладзяць у кампаніі экспертаў і медыйных персон у праграмах «Акцэнты» і «Актуальны мікрафон». А пра традыцыі сустрэчы Новага года і Раства ў сямейным коле раскажуць госці «Сямейнай праграмы». У апошнія гадзіны адыходзячага года праект «Творчы вечар» прапануе слухачам адправіцца ў віртуальнае турнэ па планеце пад рытмы любімых беларускіх і замежных хітоў.

У першыя дні новага года чакайце прэм'еру новага вяшчальнага сезона — «Радыётэка». Фрагменты навагодніх эфіраў на радыё з запісаў фондаў пачуем 1 і 2 студзеня. Спектаклі з казачнымі сюжэтамі і інтэрактыўны марафон віншаванняў таксама будуць чакаць вас у радыёэфіры ў гэтыя дні.

Навагодні эфір на «Культуры» супадзе з яго 20-годдзем. Тут з 1 да 9 студзеня пройдзе акцыя «Найлепшае канала «Культура» — у святочным эфіры». Пачуем найлепшае за мінулыя гады і зможам пазнаёміцца з прэм'ерамі — «Ранішні серыял», «Наша музыка», «Развагі пра літаратуру» і іншыя.

У дні свят эфір «Радыус FM» атрымае асаблівае музычнае афармленне. Менавіта тут «Хіт Мароз» падорыць усім стопрацэнтныя хіты. Навагодняя тэматыка не абміне і праграмы «У тэме», «Тэорыя вялікай раніцы», «Выдатны дзень» і вячэрняе шоу «Аўтадрайв». Акрамя таго, да свят выйдзе спецыяльны музычны праект «Олі Day».

Музычна-віншавальныя эфіры адбудуцца і на радыё «Сталіца». А дайджэст найбольш знакавых падзей на дзевяці мовах прадставіць у шэрагу праектаў на міжнародным радыё «Беларусь». Эстафету святочнага настрою падхопяць і рэгіянальныя радыёстанцыі. Слухайце і лавіце хвалю Новага года!

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 136

Новы год — цудоўнае свята. Таму і задача незвычайная (гл. дыяграму).

Белыя: Крe1, Фd1, Ла1, Лh1, Сc1, Cf1, Kb1, Kg1, пп. a2, b2, c2, d2, e2, f2, g2, h2 (16).

Чорныя: Крh4 (1).

Мат за 3 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Віншуем з Новым годам усіх нашых чытачоў! Выказваем шчырую падзяку за супрацоўніцтва аўтарам задач Міхаілу Кошалю, Віктару Жуку, Мікалаю Быкаву, Сяргею Дарошчанку, Паўлу Задаянаму, рашальнікам Ігару Ананічу, Васілю Жуковічу, Уладзіміру Ізотаву, Фёдару Карпею, Дзянісу Лазюту. Сяргею Цяльпуку, Васілю Барысевічу. Жадаем усім жыццёвых і шахматных перамог!

* * *

У канцы года ў Мінску прайшлі турніры першага этапу чэмпіянатаў Беларусі (іх неафіцыйна называюць «першай лігай»). У мужчынскім турніры сярод 69 удзельнікаў былі 1 гросмайстар, 1 міжнародны майстар, 5 майстроў ФІДЭ і 1 жаночы майстар ФІДЭ. У вышэйшую лігу трапілі міжнародны майстар Вячаслаў Зарубіцкі — 8 балаў з 9, майстры ФІДЭ Арцём Стрыбук (7,5) і Максім Царук (7), гросмайстар Ігар Люцко (6,5). Чэмпіёнка Беларусі Аляксандра Тарасенка фінішавала тут 16-я.

Вячаслаў Зарубіцкі — Сяргей Вашчылаў. 1. e4 e6 2. d3 c5 3. Kf3 Kc6 4. g3 d6 5. Cg2 Kf6 6. 0-0 Ce7 7. Kc3 e5 8. h3 0-0 9. Kh2 Лb8 10. f4 b5 11. Kf3 b4 12. Ke2 Фc7 13. g4 Лd8 14. Kg3 a5 15. Крh1 a4 16. g5 Ke8 17. Фe2 Kd4 18. Фf2 K:f3 19. Ф:f3 Cf8 20. Ce3 Ca6 21. Лf2 Ла8 22. Лaf1 Ла7 23. h4 Лb7 24. b3 Cb5 25. h5 Cc6 26. g6 Kf6 27. fe de 28. Cg5 Ce7 29. gf+ Кр:f7 30. h6 Лd6 31. hg Cd7 32. C:f6 C:f6 33. Ф:f6+ Л:f6 34. Л:f6+ Кр:g7 35. Kh5+, 1:0.

Арцём Стрыбук — Аляксей Храміч. 1. d4 Kf6 2. c4 Kc6 3. Kf3 e6 4. g3 Cb4+ 5. Cd2 C:d2+ 6. Ф:d2 Фe7 7. Kc3 d6 8. Cg2 0-0 9. 0-0 Лe8 10. Лac1 a5 11. Лfd1 a4 12. d5 Ka5 13. Фd3 e5 14. Kd2 Cd7 15. b4 ab3 16. ab c5 17. dc C:c6 18. e4 b6 19. Kd5 Фd8 20. Лa1 K:d5 21. cd Cd7 22. b4 Kb7 23. Лdc1 Ca4 24. Фe3 Лe7 25. Kc4 b5 26. Kb6 Лb8 27. Лc6 Фf8 28. Ch3 Kd8 29. Kd7 Л:d7 30. C:d7 K:c6 31. dc Фd8 32. Фa7, 1:0.

У жанчын (23 удзельніцы) перамагла майстар ФІДЭ Ксенія Зелянцова — 7,5 з 9. У вышэйшую лігу выйшлі і Ксенія Норман (7), Маргарыта Бендзік, Рэната Аюшава (па 6).

Мілена Сідарэня — Ксенія Зелянцова. 1. e4 c5 2. c3 g6 3. d4 cd 4. cd Cg7 5. Kc3 d6 6. f4 Kf6 7. e5 de 8. fe Kd5 9. Kf3 0-0 10. Ce2 Kc6 11. 0-0 Cg4 12. Крh1 Фd7 13. K:d5 Ф:d5 14. Ce3 Лad8 15. Cg1 Фa5 16. Фb3 C:f3 17. C:f3 K:d4 18. C:d4 Л:d4 19. e6 f5 20. Ф:b7 Cf6 21. a3 Лfd8 22. Лac1 Фe5 23. Лfe1 Фd6 24. Ф:a7 Лh4 25. h3 Фg3 26. Лed1 Л:h3+ 27. Крg1 Фh2+ 28. Крf1 Л:d1+ 29. Л:d1 Лh4 30. Фa8+ Крg7 31. Фd5 Фf4 32. Крe2 C:b2 33. Лd3 Фa4 34. Лd2 Cf6 35. Фc5 Фa6+ 36. Крf2 Лh1 37. Лe2 Фa4 38. Лd2 Ch4+ 39. Крe2 Фa6+ 40. Лd3 Ф:e6+ 41. Лe3 Лe1+ 42. Крd3 Фb3+ 43. Крd2 Фb2+ 44. Крd3 Л:e3+ 45. Ф:e3 Ф:a3+, 0:1.

* * *

У моцным жаночым турніры па бліцы на сайце chess.com (152 удзельніцы) Варвара Палякова фінішавала 19-я, Аляксандра Тарасенка — 38-я.

У XXII сусветнай алімпіядзе па завочных шахматах (на серверы) зборная Беларусі заняла трэцяе месца ў сваёй групе. За нашу каманду выступалі Віталь Астравух, Барыс Бліцко, Сяргей Уласевіч, Аляксей Малашанкаў, Міхаіл Шаблінскі і Вадзім Віслагузаў. У фінал з групы выйшлі зборныя Славеніі і Расіі.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. d8K. Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч.

Вадзім ЖЫЛКО.

ДЗЕ ШУКАЦЬ САКРЭТЫ НОВАГА ГОДА?

Тэлеканалы Белтэлерадыёкампаніі, у эфіры якіх ужо прадчуваецца набліжэнне самых чароўных свят, прадставяць сваёй аўдыторыі разнастайнае «меню» ў ноч з 31 снежня і 1 студзеня: канцэрты ў кампаніі зорак першага сезона шоу «X-Factor» і музычных калектываў медыяхолдынга, любімыя калядныя фільмы, а таксама спецвыпускі праграм.

Старт апошняму дню адыходзячага года на тэлеканале «Беларусь 1» дадуць у праграме «Добрай раніцы, Беларусь!». У вялікім святочным выпуску ранішняга шоу ўспомняць найлепшыя і самыя яркія падзеі 2021-га. А днём пра свой «Сэнс жыцця» распавядзе заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, майстар пераўвасаблення, гумару і галоўны Дзядуля Мароз краіны Уладзімір Радзівілаў.

Задаваць святочна-рамантычны тон фінальнай падрыхтоўцы будуць на працягу дня меладрамы «Навагодні экспрэс» і «За пяць хвілін да студзеня». А ў вячэрнім эфіры гледачоў чакае асаблівы падарунак ад творчай групы медыяхолдынга: музычная тэлепрэм'ера мінаючага года — талент-шоу «X-Factor у Беларусі» збіраецца «запаліць» навагодні эфір. Любімыя фіналісты і іх найлепшыя канкурсныя нумары, а таксама прафесійныя педагогі, зорныя настаўнікі і вядомыя артысты эстрады будуць спяваць для вас. У святочную ноч Руслан Аляхно, Вольга Бузава, Яўген Курчыч, Наталля Тамела, Хелена Мерааі, Дзяніс Клявер, Радыён Газманаў, Sevak, FILATOV & KARAS, ВІА «Песняры», гурт «Dabro» і многія іншыя артысты збяруцца ў вялікім гала-канцэрце, каб павіншаваць тэлегледачоў з Новым годам.

У 23.50 на «Беларусь 1» і ў эфіры іншых тэлеканалаў Белтэлерадыёкампаніі — Навагодняе віншаванне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі.

Першыя хвіліны новага 2022 года музычную эстафету падхопяць тэлеканцэрты Яўгена Кунгурова і Севака Ханагяна з прэм'ернай серыі «Зоркі эстрады на «Беларусь 1», а вечарам 1 студзеня ўбачым фільм-канцэрт Аляксандры Гайдук з новага «зорнага» цыкла. У першы дзень новага года таксама пакажуць «Галоўную ёлку краіны» ў 10.50 з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а днём — тэлеверсію Навагодняга маладзёжнага балю ў Палацы Незалежнасці.

Насычаную праграму для ўсёй сям'і падрыхтаваў і тэлеканал «Беларусь 2».Святочнымі спецвыпускамі адзначацца праекты «Уключайся!», «На тыдзень» і «Тэлебарометр», а вядучыя і карэспандэнты праекта «ПІН_КОД» паспрабуюць аднавіць атмасферу 1980-х. Тут падзеляцца сакрэтамі прыгатавання страў таго часу, успомняць культавыя фільмы, а яшчэ правядуць спецыяльную прэмію «найлепшых гледачоў».

Апошнія імгненні 2021 года на «Беларусь 2» прапануюць правесці з гумарам і песнямі і за праглядам інтэлектуальна-забаўляльнай шоу-віктарыны «Вежа», дзе спаборнічаць будуць арт-гурт «Беларусы» і каманда заслужанага артыста Беларусі Аляксандра Саладухі. А ў навагоднюю ноч тут прапануюць прагляд трох першых частак франшызы «Адзін дома».

Сацыякультурны тэлеканал, у сваю чаргу, пакажа гледачам класіку кіно для дзяцей і дарослых, познаймеціць з рэцэптамі навагодніх страў і парадуе музычнымі падарункамі. На «Беларусь 3» у 19.45 убачым тэлеканцэрт «Навагодні настрой» сімфанічнага аркестра медыяхолдынга, а ў 23.35 прагучаць хіты ансамбля народнай музыкі «Бяседа». Любімыя кампазіцыі і калядныя песні стануць душэўным суправаджэннем свята ў коле родных і блізкіх. З надыходзячымі, сябры!

Алена ДРАПКО.

«Са "Звяздой" цяплей»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 студзеня 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 тэрмасаў універсальных для ежы і напояў ARIZONE і суперпрыз — электрасамавар Kelli. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 29 студзеня 2022 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2022 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 235 газеты «Звязда» ад 4 снежня 2021 года.

Тэлефоны для даведак: (017) 271 81 53, 311 17 40.
Тэрмін правядзення гульні — 7—31 снежня 2021 года.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4117 ад 30.11.2020 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)
на I квартал або I паўгоддзе 2022 года

Жатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) *(індэкс)*

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.50 Зона Х (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.40 Навіны надвор'я.
11.00, 12.10 Драма «Тры жаданні» (12+).
13.05, 15.25 Драма «Дзеда Мароза не бывае» (12+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
18.30 Адзін дзень (12+).
19.20 Драма «Разводу не будзе» (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Зразумелая палітыка.
22.00 Серыял «След» (16+).
0.35 Арэна.
1.10 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 11.00, 21.05 Тэлебарометр.
9.05, 20.00 «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.15 «На тыдзень» (16+).
11.35 Анімацыйны серыял «Стыч!» (6+)
12.35 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
13.20 «Снупі і дробязь пузатая ў кіно» (0+).
14.45 «Усёй сям'ёй» (6+).
15.30 Камедыя «Эдзі «Арол» (16+).
17.20 «Тры першыя спатканні» (16+).
18.05 «Багіня шопінгу. Бітва бландзінак» (16+).
19.00 «На кручку» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.15 Баявік «Моцны арэшак» (12+).
23.35 Хачу ў тэлевізар!
23.40 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Качка з мёдам.
8.05, 12.00, 19.25, 23.10 Навіны культуры.
8.25 «Нацыянальны хіт-парад».
9.20 «Вялікая сям'я». Маст. фільм (12+) [СЦ]
11.05 «Генадзь Праватораў. Дырыжор ласкаю Божай». Дак. фільм (12+).
12.20 «Беларуская кухня». Фаршыраваны лінь, запечаны ў смятане.
12.50 «Наперад у мінулае».
13.15, 21.05 «Вольф Месінг. Ён бачыў скрозь час». Серыял. (16+).
14.55 «Маладыя таленты Беларусі».
15.55 «Прыгоды Электроніка». Маст. фільм (6+) [СЦ]
19.45 «Кадры жыцця». Народная артыстка Беларусі Ніна Шарубіна.
20.40 «Калыханка» (0+).
22.45 «Фарбы памяці». Мастак Яўген Зайцаў [СЦ]

Беларусь 5

6.00, 8.55, 13.30, 15.10 Хакей. Маладзёжны чэмпіянат свету (U-20).
8.20 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
10.55 Аўтаспорт. Экстрым-Е. Відэачасопіс.
11.30 Тэніс. WTA. Адэлаіда.
16.50, 22.20 Хакей. КХЛ. «Пуночсталь» (Чарапавец) — «Дынама-Мінск».
19.20, 20.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30, 1.10** Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.15 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Ну, пачакай! Вакацыі» (0+).
11.55 «Леўчык і Воўчык» (16+).
13.15, 23.25 Серыял «Замуж пасля ўсіх» (12+).
15.10 «Давай пажэнімся ў Новы год!» (16+)
16.20 «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+)
17.40, 18.20, 19.20 «Сёння ўвечары» (16+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» (12+)
20.00 Час.
21.15 «Прапаганда» (16+).
21.35 Серыял «Казанова» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
8.40 «Тыдзень».
10.40, 0.05 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
11.30 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.25, 21.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 16.50 «Глухар». Серыял (12+).
18.30 «Па сутнасці».
20.30, 23.15 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Міншчына».
22.00 «Скардзіцца дазваляецца».
0.45 «Самая карысная праграма» (16+).
1.30 «Мінтранс» (16+).

МІР

5.00 Маст. фільм «Жандар з Сен-Трапэ» (6+).
6.35 Маст. фільм «Жандар у Нью-Ёрку» (6+).
8.20 Маст. фільм «Садко» (6+).

10.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 Маст. фільм «Няўлоўныя мсціўцы» (12+).
11.40 Маст. фільм «Новыя прыгоды няўлоўных» (12+).
13.10 Маст. фільм «Карона расійскай імперыі, або Зноў няўлоўныя» (12+).
15.45 Маст. фільм «Ты — мне, я — табе» (6+).
17.20 Маст. фільм «Балада аб доблесным рыцары Айвенга» (16+).
19.15 Серыял «Адваротны бок Месяца» (16+).
0.05 Маст. фільм «Форт Рос: у пошуках прыгод» (6+).
1.50 Маст. фільм «Сямёра смелых» (12+).
3.20 М/ф (0+).

РТР—Беларусь

6.05 Серыял «Галубка» (16+).
7.40 Серыял «Чорная кроў» (12+).
9.35, 11.25 Фільм «Вой, мамач-кі!..» (12+)
11.00, 20.00 Весткі.
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (16+).
11.00, 17.00, 23.05, 5.40 «Блеф-клуб» (16+).
12.00 «Яловая субмарына» (16+).
13.10 Маст. фільм «Любоўь еще быть может» (16+).

18.00 «Да і пасля...» (16+)
19.20 Маст. фільм «Жыццё забавамі поўнае» (18+).
0.00 «Быў час» (18+).
1.10 Маст. фільм «Самазабойца» (18+).

EuroSport 1

0.00, 20.00, 21.55 Навіны (16+).
0.05, 3.30, 5.30, 8.45, 20.05 Біятлон. КС. Мужчыны (6+).
1.00, 4.00, 6.15, 8.00, 10.30, 14.05, 17.30 Скачкі на лыжах з трамплінаКС. Мужчыны (16+).
2.30, 7.00, 9.30, 23.00 Ралі-рэйд. «Дакар» (16+).
5.00 Тэлечасопіс Eurosport Winter Pass #7 (16+).
11.50, 19.00, 22.00 Лыжнае дваябор'е. КС. Каманды.
12.50 Фрыстайл. КС (16+).
15.05, 19.30, 22.30 Лыжнае дваябор'е. КС. Эстафета.
16.05, 21.00 Біятлон. КС. Жанчыны.

Кінакамедыя

1.10 Мача і батан-2 (16+).
3.15 Парналоджы, або Мілка, як ты (18+).
4.50 Еўратур (16+).
6.25 Аферысты Дзік і Джэйн (12+).
7.55 Красуні на ўцёках (16+).

9.30 Капальні цара Саламона (12+).
11.15 Хто падставіў труса Роджэра (16+).
13.05 Індзіяна Джонс: у пошуках страчанага каўчэга (6+).
15.05 Індзіяна Джонс і храм лёсу (6+).
17.10 Індзіяна Джонс і апошні крыжовы паход (12+).
19.30 Індзіяна Джонс і каралеўства хрустальнага чэрапа (12+).
21.35 Мы — Мілеры (16+).
23.35 Паездка ў Амерыку (18+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
7.10 Калекцыя «Беларусьфільма»: «Не пакідай» (12+).
9.45 «Пекла і рай Матроны». Дак. фільм (16+).
11.15 «Цуд» (12+).
13.30 «Анастасія». Анімацыйны фільм (12+).
15.10, 2.30 «Усё, што трэба нам» (16+).
19.30 «Якія вярнуліся» (16+).
20.30 «Водпуск па абмене» (16+).
22.55 «Сем'янін» (12+).
1.10 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).

ТВ 1000 ТБ1000

5.00 Гульня Эндэра (12+).
7.15 Штучны розум (12+).
10.05 Бацька нявесты (6+).
11.55 Бацька нявесты-2 (6+).

13.50 «Эмоджы фільм» (6+).
15.15 «Лега фільм» (6+).
17.00 Грань будучыні (12+).
19.00 Зорны шлях (16+).
21.10 Стартрэк: адплата (12+).
23.25 Стартрэк: бясконцасць (16+).
1.25 Парк Юрскага перыяду (16+).
3.25 Парк Юрскага перыяду-2: згублены свет (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.00 Ёлкі кудлатыя (6+).
7.40 Сябры сяброў (16+).
9.15 Варатар Галактыкі (6+).
11.10 Тры волаты: ход канём (6+).
12.25 Тры волаты і прынцэса Егіпта (6+).
13.35 Тры волаты. Спадчынніца прастола (6+).
15.05 Конь Юлій і вялікія скачкі (6+).
16.20 Вечар блазнаў, або Сур'ёзна з прывітаннем (6+).
18.05 Самы лепшы дзень (16+).

20.00 Выратуйце Колю! (12+)
21.40 Гудбай, Амерыка (12+).
23.35 Пара з будучыні (12+).
1.15 Прыцягненне (12+).
3.00 Спадарожнік (16+).
4.40 Баця (16+).

National Geographic

6.25, 8.15 Гульні розуму (16+).
7.15, 9.05, 10.05, 11.05, 14.45, 15.40, 16.35 Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога (16+).
12.00, 12.55, 13.50, 2.50, 3.40, 4.25 Сакрэты Біблііі (16+).
17.30, 18.20, 19.15, 23.40 Хрысціянства: узыходжанне да ўлады (16+).
20.05, 21.50, 5.15 Закінутыя таямніцы Біблії з Альбертам Лінам (16+).
21.00 Найбуйнейшыя тэхнагенныя катастрофы (16+).
22.45 Таямніцы Труны Гасподняй (16+).
0.30 Закінутыя гарады з Альбертам Лінам (16+).
1.20 Загадкі жыцця Ісуса (16+).
2.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).

Discovery

8.00, 8.23 Як гэта зроблена? (16+)
8.46, 9.13, 9.39, 10.06, 10.32, 10.59 Як гэта ўладкавана? (12+)
11.25 Круты цюнінг (12+).

12.18, 13.12 Залатая ліханка (16+).
14.06, 15.00, 15.54 Вялікая задума па Стывену Хокінгу (12+).
16.48, 17.42, 18.36, 19.30, 20.24, 21.18, 22.12 Махінатары (12+).
23.06, 5.00 Аляска: сям'я з лесу (16+).
0.00, 5.45 Аперацыя «Выратаванне дома»(12+).
1.47, 2.40, 3.30, 4.15 Невядомая экспедыцыя (12+).
7.15, 7.38 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.25 Слова Мітрапаліта Веніяміна на Раство Хрыстова.
6.35 Драма «Усё вырашаюць нябёсы» (12+).
8.10, 9.10 Драма «Проста раман» (16+).
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
12.10 Сэнс жыцця (12+).
12.45 «Маршрут пабудаваны» (12+).
13.20 Зоркі эстрады на «Беларусь 1».
15.10 Драма «Голас анёла» (16+).

19.15 Драма «Шчасце ў канверце» (12+).
21.00 Панарама.
21.40 Сольны канцэрт Дзяніса Клявера «Пачнём спачатку» (12+).
23.45 Драма «Узрост кахання» (12+).
1.20 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.05 Тэлебарометр.
9.05 Прыгодніцкая анімацыя «Ледніковы перыяд» (12+).
10.25 Прыгодніцкая анімацыя «Ледніковы перыяд-2: глабальнае пацяпленне» (12+).
11.50 Прыгодніцкая анімацыя «Ледніковы перыяд-3: эра дыназаўраў» (12+).
13.20 Прыгодніцкая анімацыя «Ледніковы перыяд-4: кантынентальны дрэйф» (12+).
14.45 Прыгодніцкая анімацыя «Ледніковы перыяд-5: сутыкненне непазбежнае» (6+).
16.15 Фэнтэзі «Неверагоднае жыццё Уолтара Міці» (12+).
18.10 «Вежа» (12+).
19.10 «Тата папаў» (16+).
20.50, 21.15 «Вяселле ўсляпую» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
22.40 Экшн «Венам» (16+).

Беларусь 3

7.30 «Размовы пра духоўнае». Раство Хрыстова.
7.40 «Дванаццать месяцаў». М/ф (0+).
8.35 «Навагоднія прыгоды Машы і Віці». Маст. фільм (6+).
9.40 «Беларуская кухня». Шніцаль са шчупака.
10.10 «Марозка». Маст. фільм (6+).

11.30 Галоўная ёлка краіны. Навагодняе дабрачыннае свята для дзяцей з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі.
12.40 «Сваімі словамі».
13.20 Канцэрт Сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі «Навагодні настрой».
14.10 Навагодні маладзёжны баль у Палацы Незалежнасці.
15.10, 21.05 «У пошуках капітана Гранта». Серыял (12+).
20.40 «Калыханка» (0+).
23.30 Гала-канцэрт зорак сусветнай оперы.

Беларусь 5

7.00 Фактар сілы.
7.30, 11.30, 20.25 Тэніс. WTA. Адэлаіда.
9.30 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
10.00 Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Спрынт. Мужчыны.
13.30 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Маладзечна) — «Шахцёр» (Салігорск).
15.30 Авертайм.
16.05, 22.35 Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Спрынт. Жанчыны.
17.30 Хакей. КХЛ. «Авангард» (Омск) — «Дынама-Мінск».
19.55 Спорт-цэнтр.
20.05 Вось гэта спорт!

АНТ

7.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашыя навіны.
7.10 «Віфлеем. Горад Езуса» (6+).
8.05 «Афон. Дагрукацца да нябёс» (0+).
9.10 Камедыя «Мая мама – нявеста» (12+).

10.30 «Старыя песні аб галоўным» (16+).
12.05 «Старыя песні аб галоўным-2» (16+).
13.45 «Старыя песні аб галоўным-3» (16+).
16.20 Канцэрт «Рускія Каляды» (0+).
18.35 «Лепш за ўсіх!» (0+)
21.00 «Ала Пугачова. Той самы канцэрт» (12+).
22.55 Камедыя «Француз» (12+).

СТБ

6.35, 0.40 «Вялікія таямніцы» (16+).
9.00 «Ёлкі 1914» (12+).
10.45, 15.20, 16.40, 22.15 «Легенды СССР» (16+).
13.30, 16.30, 19.30 Навіны «24 гадзіны».
13.40 «Ёлкі-3» (12+).
18.00 «Ёлкі-5» (6+).
20.30 «СТБ-спорт».
20.35 «Джэнтльмены, удачы!» (12+)

МІР

5.00, 4.45 М/ф (0+).
6.50 Маст. фільм «Калье для снежнай бабы» (16+).
8.25 Маст. фільм «Тарыф навагодні» (16+).
10.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
10.10, 19.15 Серыял «Вангелія» (12+).
22.25 Маст. фільм «Золушка» (16+).
0.05 Маст. фільм «Навагодні перапалох» (16+).
3.30 Маст. фільм «Маё каханне» (6+).

РТР—Беларусь

6.05 Серыял «Галубка» (16+).
7.40 Серыял «Чорная кроў» (12+).
9.35, 11.25 Фільм «Вой, мамач-кі!..» (12+)
11.00, 20.00 Весткі.
13.00 Каляднае інтэрв'ю Святейшага Патрыярха Кірыла.
13.25 Фільм «Свае чужыя родныя» (12+).
16.45 «Ізмайлаўскі парк». Канцэрт (16+).
18.00 «Сёння пятніца!» (12+)
20.45 Фільм «Камета Галея» (12+).

НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10, 6.55, 8.15 Сёння. Галоўнае.
6.15 Спорт-мікс.
6.25 Беларусы (6+).
7.10 Сфера інтарэсаў.
7.30 «Проста і смачна» (6+).
8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.30 Камедыя «Есці пададзена, або Асцярожна, каханне!» (12+).
10.20 «Калядная песенька года» (0+).
11.55 Камедыя «Алмаз у шакаладзе» (12+).
13.35 Фільм «Настаяцель» (16+).
15.10, 16.20 Фільм «Настаяцель-2» (16+).
17.15 «Сакрэт на мільён» (16+).
19.30 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
22.20 «Навагодняя казка» (12+).

8 канал

7.00, 15.25, 19.25, 21.05 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультсерыял «Папялушка» (6+).
8.20 «Прыколы 13-й школы» (6+).
8.25 Меладрама «Актрыса» (16+).
10.00 Серыял «Непал».
11.05 Драма «Я веру ў каханне» (12+).
13.00 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
13.50 Меладрама «Сям'я» (16+).
15.30 Мультпарад (6+).
16.35 «Гатуй як шэф» (12+).
16.50 Серыял «Полдарк» (16+).
17.50 Серыял «Дзясятае каралеўства» (12+).
19.30 Серыял «Добры доктар» (16+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.10 Меладрама «Возера надзеі» (12+).
1.15 «Надвор'е».

ВТВ

6.05, 8.15 «Раніца з гумарам» (16+).
10.25, 23.30 «КВЗ. Панашаму» (16+).
11.50 «Наш рамонт» (16+).
12.20 «Гатуем як шэф» (16+).
12.55 «Дурні і дарогі» (16+).
13.30, 17.00 Серыял «Карані» (16+).
15.00, 20.00 «Уральскія пельмені» (16+).
16.00 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
18.30 Серыял «Бацькам» (16+).
21.30 Фантастыка «Дывергент, глава 3: за сцяной» (12+).
0.00 Серыял «Дзяўчаты не здаюцца» (16+).
0.55 Серыял «Метад Лаўровай» (16+).
2.35 Серыял «Маладзёжка» (16+).
4.55 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30 «Пешшу...»
7.05 «Умка», «Ноч перад Калядамі». М/ф.
8.05 Кіно пра кіно [СЦ].
8.45 «Гараж». Маст. фільм [СЦ].
10.20 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
10.50 «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм [СЦ].
12.00, 1.35 «Серэнгеці». Дак. фільм [СЦ].
12.50 «Вялікія і маленькія».
13.55, 2.30 «Элементы з Джэймсам Брэдбернам». Серыял [СЦ].
14.20, 0.25 «Д'Артаньян і тры мушкецёры». Маст. фільм [СЦ].
15.55 «Гісторыя рускага побыту». Серыял [СЦ].
16.25 Вялікая опера.
18.35 «Міміно». Маст. фільм [СЦ].
20.10 Вялікія імёны.
21.05 «Таксіст». Маст. фільм.
22.55 «Queen. Венгерская рапсодыя». Канцэрт.

Настальгія

6.00 «СевАлогія» (18+).
6.55, 8.45, 9.40, 11.35, 12.45, 14.30, 15.40, 17.00, 20.25, 21.40, 23.40, 3.40 Музычная настальгія (12+).
7.20 Маст. фільм «Брунетка за 30 капеек» (18+).

9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.05, 17.40, 23.00, 5.20 «Блеф-клуб» (18+).
12.00 «Быў час» (18+).
13.10 Маст. фільм «Самазабойца» (18+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+)
19.00 Маст. фільм «Сустрэнемся на Таіці» (18+).
0.00 Маст. фільм «Пастка для адзінокага мужчыны» (18+).
1.30 Канцэрт гурта «Круиз» (16+).
3.50 Маст. фільм «Мянялы» (18+).

EuroSport 1

0.00, 22.55 Навіны (16+).
0.05, 0.30 Горныя лыжы. КС. Жанчыны (16+).
1.00, 4.15, 6.00, 9.15, 13.00, 19.00, 22.05 Скачкі на лыжах з трамплінаКС. Мужчыны (16+).
2.30, 7.00, 10.30, 23.00 Ралі-рэйд. «Дакар» (16+).
3.30, 8.45, 16.10, 18.30 Лыжныя гонкі. «Тур дэ Скі». Мужчыны (6+).
5.00, 5.30, 8.00, 15.25 Лыжныя гонкі. «Тур дэ Скі». Жанчыны (6+).
11.30 Тэніс. Australian Open. Жанчыны (6+).
14.00 Тэлечасопіс Eurosport Winter Pass #7 (16+).
14.30 Тэлечасопіс Essential Olympic #1 (16+).
14.40, 14.55 Тэлечасопіс «На грані» (16+).
15.10 Тэлечасопіс Winter Tracks (16+).
16.40, 21.40 Горныя лыжы. КС. Жанчыны (16+).
17.20, 20.30 Горныя лыжы. КС. Мужчыны.

Кінакамедыя

0.40 Таксі (16+).
2.15 Таксі-2 (16+).
3.55 Таксі-3 (16+).
5.20 Выпадковы муж (16+).
6.50 Капальні цара Саламона (12+).
8.40 Паездка ў Амерыку (18+).
10.45 Няма чаго губляць (16+).
12.30 Вельмі дрэнная вучылка (18+).

14.05 Еўратур (16+).
15.35 Самы лепшы дзень (16+).
17.30 Мы — Мілеры (16+).
19.30 Васабі (16+).
21.05 Красуні на ўцёках (16+).
22.40 Дзядуля лёгкіх паводзін (18+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.10 «Участак лейтэнанта Качуры» (16+).
10.10 «Перыскоп» (16+).
10.30 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
12.00 «Знакі лёсу» (16+).
12.40, 16.50 «Старац» (16+).
13.50, 18.40, 3.25 «Сляпая» (16+).
15.00, 19.50, 2.30 «Варажбітка» (16+).
16.10 «Цуд» (12+).
18.00 «Уіджы!» (16+)
21.00 «13» (16+).
22.10 «Брыгада» (16+).
23.20 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.25 «Лінія абароны» (16+).
1.00 «Няспячыя ў Сіэтле» (16+).
3.50 «Як сустрэнеш, так і правядзеш!» Дак. фільм (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.00, 3.00 Прымадонна (16+).
7.15, 1.05 Чатыры вяселлі і адно пахаванне (16+).
9.25 Прыцемкі (16+).
11.30 Прыцемкі. Сага. Маладзік (12+).
13.40 Монстры на канікулах (6+).
15.15 Монстры на канікулах-2 (6+).
16.50 Прыцемкі. Сага. Зацьменне (16+).
19.00, 21.00 Прыцемкі. Сага. Світанне (12+).
22.55 Інтэрв'ю з вампірам(16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.25 Ёлкі новыя (6+).
7.55 Ёлкі апошнія (6+).
9.25 Кіліманджара (16+).
10.45 Прыцягненне (12+).
12.40 Іван Царэвіч і Шэры Воўк-4 (6+).
14.10 Тры валаты і Шамаханская царыца (12+).
15.25 Тры валаты на далёкіх берагах (6+).
16.40 Сябры сяброў (16+).
18.20 Прабабуля лёгкіх паводзін. Пачатак (16+).

20.00 Ну, добры дзень, Аксана Сакалова! (16+)
21.45 Красуня ва ўдары (12+).
23.30 Каханне і монстры (16+).
1.00 Дарагі тата (12+).
2.25 Баця (16+).
3.35 Варатар Галактыкі (6+).

National Geographic

7.25, 9.05 Гульні розуму (16+).
8.15, 10.00, 10.50 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
11.45, 12.25 2000-я: час, калі мы ўбачылі ўсё (16+).
13.15, 14.10, 15.00, 15.55, 16.45 Космас: магчымыя сусветы (16+).
17.35, 18.00, 18.25, 18.50 Фабрыка ежы ў Амерыцы (16+).
19.15, 20.05, 1.05 Расследаванне авіякатастроф (16+).
21.00 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
21.50, 22.40, 23.30 Нязведаныя воды з Джэрэмі Уэйдам (16+).
1.55, 2.35 Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
3.20, 4.05 Кантрабанда з Мар'янай ван Зэлер (16+).
5.15 Аляска: новае пакаленне (16+).

Discovery

8.00, 8.23 Як гэта зроблена? (16+)
8.46, 9.13, 9.39, 10.06, 10.32, 10.59 Як гэта ўладкавана? (12+)
11.25 Махінатары (12+).
12.18 Суперфабрыкі любімая ежа (12+).
13.12 Джэф Безас на мяжы космасу (12+).
14.06, 15.00, 15.54, 16.48 Астранаўты-аматары (12+).
17.42, 18.36, 19.30, 20.24, 21.18, 22.12 Ратавальнікі Эверэста (16+).
23.06, 0.00, 0.54, 1.47, 2.40, 3.30, 4.15, 5.00, 5.45, 6.30 Разбуральнікі легенд (16+).
7.15, 7.38 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 6 студзеня ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15 Зона Х (16+).
8.50 Слова Архібіскупа Іосіфа Станеўскага на свята Богаяўлення.
9.10 Серыял «След» (16+).
10.55 «Скажынемаўчы».
11.50, 12.10, 13.05 Драма «Каханне па памылцы» (12+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25, 19.20 Драма «Проста раман» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
18.30 Адзін дзень (12+).
21.00 Панарама.
21.50 Святочнае Набажэнства на Раство Хрыстова з Мінскага Свята Духава кафедральнага сабора.
23.50 Драма «Усё вырашаюць нябёсы» (12+).

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.05 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.10 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.05 Баявік «Моцны арэшак-4» (16+).
13.15, 0.00 «Сямейныя гісторыі» (16+).
13.45 Анімацыйны серыял «Стыч!» (6+)
14.50 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Вежа» (12+).
17.55 М/с «Машыны песенькі» (0+).
18.10 «Арол і рэшка. 10 гадоў» (16+).
19.10 «Клон». Серыял (16+).
20.10, 21.15 Баявік «Моцны арэшак: добры дзень, каб памерці» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
22.00 Фэнтэзі «Неверагоднае жыццё Уолтара Міці» (12+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Бліны з ліверам.
8.05, 12.00, 19.40, 23.10 Навіны культуры.
8.25, 16.45 «Легенды кіно». Міхаіл Баярскі (12+).
9.00, 17.25 «Сабака на сене». Маст. фільм (12+).
11.15 «Планета Алы Шэлест». Дак. фільм (12+).
12.20 «Беларуская кухня». Тушонкі.
12.50 «Сваімі словамі».
13.25, 21.05 «Вольф Месінг. Ён бачыў скрозь час». Серыял. (16+).
15.05 «Этот мир придуман не нами». Канцэрт да 95-годдзя кампазітара Аляксандра Зацэпіна.
19.55 «Бенедыкт Дыбоўскі. Тайны Свяшчэннага мора». Гісторыка-біяграфічны фільм (12+) [СЦ]
20.40 «Калыханка» (0+).
22.40 «Арт-гісторыі». Царская брама.

Беларусь 5

6.45 Азбука спорту.
7.00 Аўтаспорт. Экстрым-Е. Відэачасопіс.
7.30, 13.00 Тэніс. WTA. Адэлаіда.
9.30, 21.10 Хакей. Маладзёжны чэмпіянат свету (U-20).
11.00 Тэніс. WTA. Мельбурн.
15.10 Між іншым.
15.30 Агнявы рубеж.
16.05, 23.05 Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Спрынт. Мужчыны.
17.30 Слэм-данк.
18.05 Фактар сілы.
18.40 Спорт-цэнтр.
18.50 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Маладзечна) — «Шахцёр» (Салігорск).

АНТ

6.00, 7.10, 8.10 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30, 1.30** Нашы навіны.
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.15 «Аляксандр Шырвінт. Іронія ратуе ад усяго» (16+).
13.15, 23.35 Серыял «Я цябе знайду» (16+).
15.10 «Давай пажэнімся ў Новы год!» (16+)
16.20, 18.20 «Сёння ўвечары» (16+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» (12+)
19.00 «Поле цудаў» (16+).
20.00 Час.
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.55 Серыял «Казанова» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 1.50 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.00 «Глядзець усім!» (16+)
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20, 21.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 21.50 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.45, 16.50 «Глухар». Серыял (12+).
20.30, 23.15 «СТБ-спорт».
20.35 «Сталічныя падрабязнасці».
20.45 «Міншчына».
23.20 «Вялікія таямніцы» (16+).

МІР

5.00, 4.20 М/ф (0+).
5.15 Маст. фільм «Форт Рос: у пошуках прыгод» (6+).
7.00 Маст. фільм «Прышэльцы» (16+).
8.55, 10.10 Маст. фільм «Прышэльцы-2: калідоры часу» (12+).
10.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
11.20 Маст. фільм «Прышэльцы-3: узяцце Бастыліі» (12+).
13.30 Маст. фільм «Няўлоўныя мсціўцы» (12+).
15.00 Маст. фільм «Новыя прыгоды няўлоўных» (12+).
16.30 Маст. фільм «Карона расійскай імперыі, або Зноў няўлоўныя» (12+).
19.15 Маст. фільм «Тарыф навагодні» (16+).
20.50 Маст. фільм «Папялушка» (16+).
22.30 Маст. фільм «Шукайце жанчыну» (12+).
1.10 Маст. фільм «Жандар і жандарметкі» (12+).
2.40 Маст. фільм «Жандар на адпачынку» (12+).

РТР—Беларусь

6.05 Серыял «Галубка» (16+).
7.40 Серыял «Чорная кроў» (12+).
9.35, 11.25, 14.00 Фільм «Вой, ма-мач-кі!..» (12+)
11.00, 20.00 Весткі.
12.50 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 22.50 Навіны — Беларусь.
15.55, 17.00 Серыял «Сядзелка» (12+).
21.05 Фільм «Адагрэй маё сэрца» (12+).
23.00 Нараджэнне Хрыстова. Прамая трансляцыя ўрачыстага Набажэнства.

НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10, 6.55, 8.15, 16.15, 19.25, 21.40, 23.45 Сёння. Галоўнае.
6.15 Спорт-мікс.
6.25 Беларусы (6+).
7.10 Сфера інтарэсаў.
7.30 Гісторыі выратавання (12+).
8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.30 Фільм «Супраць усіх правіл» (16+).
10.20, 0.00 Баявік «Маёр Ветраў» (16+).
11.15 Серыял «Ляснік. Свая зямля» (16+).
14.00, 16.20 Дэтэктыў «Кансультант. Ліхія часы» (16+).
19.40 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
21.45 «Партфоліа». Юбілейны канцэрт Ларысы Далінай (12+).

8 канал

7.00, 14.50, 17.45, 21.05, 0.30 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад (6+).
7.35, 14.55 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.40 Камедыя «Сірата казанская» (12+).
9.00 Серыял «Новая Гвінея».
9.50 Камедыя «Шукаю сябра на канец свету» (12+).
11.30 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).
12.20 Серыял «Аферысты» (16+).
15.00 Мультпарад. «Сакрэтная служба Санта Клаўса» (6+).
16.40 «Хачу ў Парыж» (12+).
16.45 Серыял «Полдарк» (16+).
17.50 Серыял «Дзясятае каралеўства» (12+).
19.25 Серыял «Добры доктар» (16+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.10 Драма «Тытанік» (16+).

ВТБ

6.05, 8.15 «Раніца з гумарам» (16+).
10.25, 23.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
11.50 «Дурні і дарогі» (16+).
13.30, 17.00 Серыял «Карані» (16+).
15.00, 20.00 «Уральскія пельмені» (16+).
15.55 «Гатуем як шэф» (16+).
16.25 «Галерэя прыгажосці» (16+).
18.30 Серыял «Бацькам» (16+).
21.30 «Суперліга» (16+).
0.00 Серыял «Дзяўчаты не здаюцца» (16+).
0.55 Серыял «Метад Лаўровай» (16+).
2.35 Серыял «Маладзёжка» (16+).
4.55 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30 «Пешшу...»
7.05 «У лесе нарадзілася ялінка», «Трое з Прастаквашына», «Вакацыі ў Прастаквашыне», «Зіма ў Прастаквашыне». М/ф.
8.05 Кіно аб кіно.
8.45 «Міміно». Маст. фільм [СЦ].
10.20 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
10.50 «У пошуках капітана Гранта». Маст. фільм [СЦ].
11.55 «Святло і цемра — містэрыя жыцця Аляксандра Скрабіна». Дак. фільм.
12.35 Дзяржаўны акадэмічны Кубанскі казачы хор. Канцэрт у Маскоўскім міжнародным Доме музыкі.
14.05 «Элементы з Джэймсам Брэдбернам». Серыял [СЦ].
14.35 «Д'Артаньян і тры мушкецёры». Маст. фільм [СЦ].
15.55 «Гісторыя рускага побыту». Серыял [СЦ].
16.25 «Ноч перад Калядамі». Спектакль.
17.45 «Наш дом». Маст. фільм [СЦ].
19.20 «Энігма. Бруна Мансенжан».
20.40 Вялікія імёны.
21.35 «Сэрца не камень». Маст. фільм.
23.50 Георгій Свірыдаў. Харавыя творы.
1.10 Лета Гасподняе. Нараджэнне Хрыстова [СЦ].
1.40 Краіна птушак.
2.20 «І смех і грэх», «Руская напевы», «Рыцарскі раман». М/ф для дарослых.

Настальгія

6.00 «Быў час» (18+).
6.45, 8.30, 9.40, 11.00, 14.25, 15.40, 17.40, 18.55, 20.40, 21.40, 23.40, 0.55, 2.45, 3.40, 5.30 Музычная настальгія.
7.10 Маст. фільм «Самазабойца» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
11.40, 17.00, 23.00, 5.05 «Блеф-клуб» (18+).
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
13.00 Маст. фільм «Сустрэнемся на Таіці» (18+).
18.00 «Яловая субмарына» (16+).
19.10 Маст. фільм «Любовь еще быть может» (16+)
0.00 «СевАлогія» (18+).
1.20 Маст. фільм «Брунетка за 30 капеек» (18+).

EuroSport 1

0.00, 1.25, 18.55, 22.10 Навіны (16+).
0.05, 0.45, 3.30, 5.00, 5.30, 8.00, 8.45, 14.30. Горныя лыжы. КС. Мужчыны (16+).
1.30, 4.00, 6.00, 9.30, 13.30, 18.00, 19.00, 22.15 Скачкі на лыжах з трамплінаў. КС. Мужчыны (16+).
2.30, 7.00, 10.30, 23.00 Рали-рэйд. «Дакар» (16+).
11.30 Тэніс. Australian Open. Мужчыны (6+).
13.00, 17.30 Тэлечасопіс Eurosport Winter Pass #7 (16+).
15.00, 15.30 Біятлон. «Калядная гонка» (6+).
16.05, 21.30 Біятлон. КС. Мужчыны.

Кінакамедыя

0.25 Таксі-4 (16+).
2.00 Скінь маму з цягніка (12+).
3.40 Лаві момант (16+).
5.00 Тэрмінал (12+).
7.15 Голы пісталет (16+).
8.45 Голы пісталет-2 1/2: пах страху (12+).
10.10 Голы пісталет-33 1/3: апошні выпад (16+).
11.35 Мы — Мілеры (16+).
13.35 Хто я? (12+)
15.45 Кракадзіл Дандзі (12+).
17.30 Кракадзіл Дандзі-2 (6+).
19.30 1+1 (16+).

21.30 Хто падставіў труса Роджэра (16+).
23.15 Мача і батан (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.55 «Участак лейтэнанта Качуры» (16+).
9.55 «Паглядзім» (12+).
10.35 «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
12.00 «Знакі лёсу» (16+).
12.40, 16.50 «Старац» (16+).
13.50, 18.40, 2.35 «Сляпая» (16+).
15.00, 19.50, 3.30 «Варажбітка» (16+).
16.10 «Цуд» (12+).
18.00 «Уіджы!» (16+)
21.00 «13» (16+).
22.10 «Брыгада» (16+).
23.20 «Пекла і рай Матроны». Дак. фільм (16+).
0.55 «Ноэль» (16+).
4.25 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.00 Буслы (6+).
6.15 Дзённікі нянькі (16+).
7.55 Інтэрв'ю з вампірам (16+).
10.05, 12.00 Прыцемкі. Сага. Світанне (12+).
13.55 Смурфікі (6+).

15.35 Смурфікі-2 (6+).
17.25 Смурфікі: закінутая вёска (6+).
19.00 Гульня Эндэра (12+).
20.55 Грань будучыні (12+).
22.55 Штучны розум (12+).
1.25 Бацька нявесты (6+).
3.10 Бацька нявесты-2 (6+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Самы Новы год! (16+)
7.00 Ёлкі 1914 (6+).
8.45 З Новым годам, мамы! (6+)
10.10 Красуня ва ўдары (12+).
11.50 Тры волаты і Шамаханская царыца (12+).
13.10 Тры волаты на далёкіх берагах (6+).
14.20 Тры волаты: ход канём (6+).
15.35 Тры волаты і прынцэса Егіпта (6+).
16.45 Самы Новы год! (16+)
18.15 Сэрца і як ім карыстацца (16+).
20.00 Гуляй, Вася! Спатканне на Балі (16+).
21.55 Неадэкватныя людзі (16+).

23.50 Неадэкватныя людзі-2 (16+).
1.50 Спадарожнік (16+).
3.40 Маёр Гром: Чумны Доктар (12+).

National Geographic

6.00, 5.35 Навуковыя глупствы (16+).
7.20, 8.10 Гульні розуму (16+).
9.00, 9.55, 10.45 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
11.40, 12.35 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас (16+).
13.25, 14.15, 15.05, 15.55, 16.50 Найбуйнейшыя тэхнагенныя катастрофы (16+).
17.40, 18.05, 18.30, 18.55 Фабрыка ежы ў Амерыцы (16+).
19.20, 20.10, 21.00, 1.15 Расследаванні авіякатастроф (16+).
22.40, 23.35, 0.25 Дзіўны аэрапорт Нью-Ёрка (16+).
2.00, 2.45 Нападзенне на Пёрл-Харбар: хвіліна за хвілінай (16+).
3.30, 4.15 Гітлер супраць Амерыкі (16+).
4.55 Апошнія крокі Гітлера (16+).

Discovery

8.00, 8.23, 12.18, 12.45, 13.12, 13.39, 14.06, 14.33, 15.00, 15.27, 15.54, 16.21, 16.48, 17.15, 17.42, 18.09, 18.36, 19.03, 19.30, 19.57, 20.24, 20.51 Як гэта зроблена? (16+)
8.46, 9.13, 9.39, 10.06, 10.32, 10.59 Як гэта ўладкавана? (12+)
11.25 Махінатары (12+).

21.18 Суперфабрыкі любімая ежа (12+).
22.12 Траса Калыма дабрацца насуперак (12+).
23.06, 0.00, 0.54, 5.00, 5.45, 6.30 Залатая ліханка (16+).
1.47, 2.40, 3.30 Вялікая задума па Стывену Хокінгу (12+).
4.15 Джэф Безас на мяжы космасу (12+).
7.15, 7.38 Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

ДАБРАБЫТ КРАІНЫ — ПЕРШ ЗА ЎСЁ!

Сенатары ўхвалілі змяненні ў законах «Аб свабодных эканамічных зонах» і «Аб інвестыцыях»

На закрыцці шостай сесіі члены Савета Рэспублікі разгледзелі два профільныя законапраекты, якія павінны паўплываць на інвестыцыйны клімат у краіне.

— Мы дастаткова часта кажам аб удасканаленні інвестыцыйнага заканадаўства як найважнейшага драйвера для росту замежных і ўнутраных інвестыцый, — звярнулася да калег-сенатараў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ.** — У сувязі з гэтым хачу адзначыць, што нам трэба разгледзець адразу два законапраекты, арыентаваныя на рашэнне гэтай задачы. Не памылюся, калі скажу, што свабодныя эканамічныя зоны ў Беларусі — гэта тэрыторыі, дзе сёння можна будаваць паспяховы бізнес.

> На долю трох краін (Расія, Украіна, Кіпр) сёння прыходзіцца 70 % прамых інвестыцый у беларускую эканоміку.

Як паведаміла старшыня профільнай камісіі, у Беларусі функцыянуе шэсць свабодных эканамічных зон. Па стане на 1 кастрычніка ў якасці рэзідэнтаў СЭЗ зарэгістравана 429 кампаній, дзе працуе каля 137 тысяч чалавек. Тут рэалізоўваюцца праекты з прыцягненнем інвестыцый на суму каля сямі мільярдаў долараў больш чым з 30 краін свету.

— Люстэрка эфектыўнасці любой прэферэнцыйнай тэрыторыі — гэта дынаміка яе асноўных эканамічных паказчыкаў, — падкрэсліла Таццяна Рунец і прывяла ключавыя з іх. — За дзевяць месяцаў рэзідэнты ўсіх СЭЗ нарасцілі аб'ёмы вытворчасці, выручкі, экспарту тавараў у 1,4 раза, інвестыцыі ў асноўны капітал — больш чым на 15 % пры агульным па краіне зніжэнні інвестыцыйнай актыўнасці. Як вынік — усе СЭЗ атрымалі прыбытак, што дазволіла амаль на чвэрць павысіць заробкі працоўным калектывам.

Старшыня профільнай камісіі робіць выснову: свабодныя эканамічныя зоны па праве з'яўляюцца пунктамі росту ў рэгіёнах.

> За 9 месяцаў бягучага года ў рэальны сектар эканомікі замежныя інвестары ўклалі 6,7 мільярда долараў ЗША інвестыцый, што на 104,5 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

Акрамя таго, яна прывяла яшчэ крыху статыстыкі.

— Па выніках дзевяці месяцаў на гэтых тэрыторыях сіламі пяці працэнтаў занятых па краіне фарміруецца 18 % аб'ёмаў вытворчасці прамысловай прадукцыі і 21 % экспарту тавараў. Рэзідэнты прыцягнулі пятую частку прамых замежных інвестыцый у Беларусь, — падкрэслівае Таццяна Рунец і акцэнтуе ўвагу, што прыведзеныя лічбы пацвярджаюць эфектыўнасць СЭЗ як інвестыцыйных пляцовак.

Сенатар адзначае: вельмі важна захаваць дынаміку іх развіцця, удасканальваючы і прававую базу. Таму на разгляд членаў Савета Рэспублікі вынесены адпаведны законапраект.

— Яго распрацоўка таксама стасуецца з комплекснай аптымізацыяй паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы пры захаванні агульнай збалансаванасці сістэмы дзяржаўнага кіравання, — падкрэсліла выступоўца.

Паводле яе слоў, асноўная навацыя — перадача паўнамоцтваў па змяненні межаў свабодных эканамічных зон ад кіраўніка дзяржавы да Савета Міністраў. Пры гэтым Прэзідэнт краіны па-ранейшаму будзе ўзгадняць уключэнне ў межы СЭЗ сельскагаспадарчых і лясных тэрыторый.

— Лічым гэта вельмі важнай опцыяй з пункту гледжання захавання нацыянальнага багацця, — выказала меркаванне старшыня профільнай камісіі.

Яна пераканана, што законапраект у першую чаргу скароціць карэкціроўку межаў СЭЗ, а значыць, і час ад ідэі да пачатку рэалізацыі новых інвестыцыйных праектаў, тым самым стымулюючы патэнцыйных інвестараў да ўкладання рэсурсаў.

— Гэта мае важнае значэнне для паўнавартаснага запуску новага інвестыцыйнага цыкла і прыцягнення інвестыцый у рэгіёны, — падкрэслівае Таццяна Рунец і рэкамендуе калегам адобрыць змяненні ў адпаведным праекце закона, з чым яны і пагадзіліся.

***

Другім важным дакументам, накіраваным на палёгкі ў інвестыцыйнай дзейнасці, стаў зменены Закон «Аб інвестыцыях».

— Інвестыцыі з'яўляюцца ключавым фактарам устойлівага развіцця прадпрыемстваў, рэгіёнаў і краіны ў цэлым. Таму вельмі важна на пастаяннай аснове забяспечваць іх станоўчую дынаміку, — нагадала Таццяна Рунец і паведаміла, што за 9 месяцаў бягучага года ў рэальны сектар эканомікі замежныя інвестары ўклалі 6,7 мільярда долараў ЗША інвестыцый, што на 104,5 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

Паводле яе слоў, заданне па інвестыцыях у асноўны капітал па выніках трох кварталаў выканалі толькі Брэсцкая (101,6 % пры заданні 101 %) і Віцебская (98,4 % пры заданні 98 %) вобласці.

Акрамя таго, сенатар звярнула ўвагу на высокую геаграфічную канцэнтрацыю інвестараў. У прыватнасці, на долю трох краін (Расія, Украіна, Кіпр) сёння прыходзіцца 70 % прамых інвестыцый у беларускую эканоміку.

— Дадзеная статыстыка сведчыць, што змены ў інвестыцыйным заканадаўстве наспелі, — акцэнтавала старшыня профільнай камісіі і нагадала калегам аб неабходнасці стварэння прывабных умоў, у першую чаргу для стратэгічнага інвестара.

> У Беларусі функцыянуе шэсць свабодных эканамічных зон. Па стане на 1 кастрычніка ў якасці рэзідэнтаў СЭЗ зарэгістравана 429 кампаній, дзе працуе каля 137 тысяч чалавек. Тут рэалізоўваюцца праекты з прыцягненнем інвестыцый на суму каля сямі мільярдаў долараў больш чым з 30 краін свету.

Як адзначыла сенатар, у абноўленым Законе «Аб інвестыцыях» прадугледжваюцца наступныя змены.

— Па-першае, выкарыстанне стабілізацыйнай агаворкі, згодна з якой інвестару могуць быць дадзены гарантыі ад неспрыяльнай змены падатковага заканадаўства, — паведаміла яна і падкрэсліла, што Савет Рэспублікі выступаў адным з ініцыятараў гэтай нормы.

Акрамя таго, другім важным момантам з'яўляецца кампенсацыя кошту нацыяналізаванай маёмасці, створанай у працэсе інвеставання. У прыватнасці, замацоўваецца прынцып паўнаты і своечасовасці такой кампенсацыі.

— Па-трэцяе, уводзіцца свайго роду «тэрмін даўнасці» ў частцы прад'яўлення патрабаванняў да інвестара, якія ўплываюць на яго правы і законныя інтарэсы, — тры гады, — паведаміла Таццяна Рунец і разам з тым адзначыла, што гэтая норма не распаўсюджваецца на супрацьпраўныя дзеянні інвестара.

Старшыня профільнай камісіі таксама нагадала, што ў сакавіку бягучага года ў Савеце Рэспублікі праводзіўся круглы стол, прысвечаны гэтаму законапраекту. Па выніках абмеркавання Міністэрству эканомікі было рэкамендавана забяспечыць пакеты прынцып разгляду НПА ў сферы інвестыцый. Як адзначыла выступоўца, прапанова была ўлічана.

Акрамя таго, на экспертным савеце пры Савеце Рэспублікі былі разгледжаны папраўкі ў Дэкрэт кіраўніка дзяржавы № 10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для ажыццяўлення інвестыцый у Рэспубліцы Беларусь».

— У комплексе з іншымі мерамі па паляпшэнні інвестыцыйнага клімату абноўленае заканадаўства ў дадзенай сферы забяспечыць рост унутраных і замежных інвестыцый у беларускую эканоміку, — выказала меркаванне сенатар і рэкамендавала калегам адобрыць праект закона «Аб змене Закона Рэспублікі Беларусь «Аб інвестыцыях». З чым сенатары і пагадзіліся.

Вольга АНУФРЫЕВА.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Паскардзіўся на... скаржнікаў!

Днямі на прамой лініі ў Віцебскім абласным выканаўчым камітэце «дзяжурыў» старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў. Да народнага выбранніка звярнуліся тры чалавекі.

Першым на сувязі быў жыхар Аршанскага раёна, які папрасіў... не адносіцца сур'ёзна да зямлячкі, якая вельмі часта скардзіцца па многіх пытаннях у розныя інстанцыі ад імя свайго сына, якога прызналі недзеяздольным. Раней гэта рабіў апошні. Такіх называюць «прафесійнымі скаржнікамі». Цяпер яго апякуе маці, і «бамбардзіроўкі скаргамі» дзяржаўных органаў працягваюцца.

Другі званок быў з Оршы. Жанчына папрасіла садзейнічання ў тым, каб у былым ведамасным двухпавярховым доме не з усімі выгодамі, дзе ўсе кватэры, акрамя адной, прыватызаваны, абслугоўванне па пытаннях ЖКХ, у тым ліку каналізацыйную адпампоўку, рабілі па фіксаваных цэнах, а не, як цяпер, камерцыйных. На сёння па кішэні вельмі б'юць расцэнкі той жа адпампоўкі. Дэпутат паабяцаў праінфармаваць адказных асоб мясцовай улады, каб пастараліся знайсці вырашэнне праблемы.

Апошнім патэлефанаваў жыхар Сенненскага раёна. Пенсіянер у вельмі паважаным узросце выказаў меркаванне аб тым, што развіццё сельскай гаспадаркі ў яго краі пакуль што, на яго погляд, вядзецца недастаткова паспяхова. Землі, па яго назіраннях, зарастаюць, таму ёсць занепакоенасць, што сельскагаспадарчыя плошчы не запатрабаваны ў параўнанні з савецкім часам. Памяншэнне пасяўной плошчы — праблема, упэўнены заяўнік. І гэтыя думкі будуць прааналізаваны.

Як народны выбраннік спікер абласнога парламента пастаянна на сувязі, даступны для зваротаў у любой форме. У прыватнасці, часта гутарыць са сваімі выбаршчыкамі з Гарадоччыны, кожны месяц працуе ў складзе інфармацыйна-прапагандысцкіх груп у розных рэгіёнах.

Людзі нярэдка пазнаюць яго на вуліцы і ў іншых грамадскіх месцах і агучваюць праблемы, просяць падказаць, які знайсці выхад са складанай жыццёвай сітуацыі, нярэдка дзякуюць за аказаную дапамогу і зноў нешта просяць, бо ўпэўніліся ў эфектыўнасці дзейнасці дэпутата.

Ды і, акрамя ўсяго іншага, яму часта тэлефануюць наўпрост у кабінет, бо нумар службовага тэлефона ўказаны на сайце аблвыканкама.

— Усе звароты важныя, дробных пытанняў няма, заўсёды трэба ўважліва выслухаць чалавека і пастарацца аказаць яму дапамогу, выказаць словы разумення і падтрымкі, — рэзюмаваў Уладзімір Цярэнцьеў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.

МЕРКАВАННЕ

«ТАКОЕ ЗАБЫЦЬ НЕЛЬГА. ЯК І ДАРАВАЦЬ»

ДЭПУТАТ Палаты прадстаўнікоў Наталля ТАРАСЕНКА пра своечасовасць закона аб генацыдзе беларускага насельніцтва:

— У Вялікай Айчыннай вайне Беларусь страціла кожнага трэцяга свайго жыхара. Ад рук акупантаў загінула больш за 2 мільёны беларусаў. У краіне было знішчана 5295 населеных пунктаў, у тым ліку спалена дашчэнту разам з насельніцтвам 628 вёсак. З 270 беларускіх гарадоў фашысты спалілі і разбурылі 209. З амаль 400 тысяч чалавек, якія былі вывезены на прымусовыя работы ў Германію, на Радзіму вярнулася толькі крыху больш за 124 тысячы. У 260 лагерах смерці і 170 гета, створаных на тэрыторыі Беларусі, закатавана каля мільёна 400 тысяч чалавек.

15 снежня дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі Закон «Аб генацыдзе беларускага народа». У рамках распачатай Генеральнай пракуратурай крымінальнай справы па факце генацыду насельніцтва Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд было ўстаноўлена больш за 300 раней невядомых месцаў пахаванняў грамадзян часоў акупацыі, а таксама магчымыя месцы пахаванняў. Апытана больш за 12 тысяч сведак, больш чым сем тысяч якіх прайшлі пекла канцлагераў. Жыхароў Беларусі знішчалі не толькі спецыяльна навучаныя і падрыхтаваныя для гэтага падраздзяленні нямецкай арміі, але і прадстаўнікі нашых найбліжэйшых суседзяў — польскія, украінскія, літоўскія, латышскія, рускія, румынскія нацысты.

З прыняццем адпаведнага закона ўводзіцца крымінальная адказнасць за прысутнасць у друкаваным або вусным выступленні адмаўлення факта генацыду беларускага народа, — удакладняе дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Наталля Тарасенка. — Пакаранне прадугледжвае арышт або абмежаванне (пазбаўленне) волі на тэрмін да пяці гадоў, а за паўторнае злачынства — на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў. Адмаўленне генацыду беларускага народа — пажыўная глеба для адраджэння нацызму і яго «перафарматавання» ў больш сучасныя і ўдасканаленыя формы. Народ, які сябе паважае, павінен захаваць сваю гісторыю, перадаючы яе як вялікую каштоўнасць з пакалення ў пакаленне, ні на хвіліну не адыходзячы ад карпатлівай і высакароднай работы па запаўненні белых старонак жыцця сваёй краіны і народа праўдзівымі фактамі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Ірына САЧКОЎСКАЯ:

«Кожны неабыякавы беларус мог паўдзельнічаць у распрацоўцы змяненняў у Асноўны Закон»

ЧЛЕН Савета Рэспублікі, загадчык натарыяльнай канторы г. Пінска Брэсцкай вобласці:

— Канстытуцыя ў любой дзяржаве з'яўляецца Асноўным Законам, які вызначае асноўныя напрамкі, мэты, задачы развіцця. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь за больш чым чвэрць стагоддзя гэта даказала. І Канстытуцыя не вычарпала свой патэнцыял.

Але цяпер усе мы з'яўляемся сведкамі тых змен, якія адбываюцца як у нашай краіне, так і за яе межамі. Змены ў краіне закранулі эканамічныя працэсы, грамадзянскую супольнасць. За час дзеяння цяперашняй Канстытуцыі выраслa цэлае пакаленне маладых беларусаў. Стварылася напружаная сітуацыя вакол нашай краіны і за яе межамі. У такіх умовах само жыццё прадыктавала неабходнасць змянення Асноўнага Закона Рэспублікі Беларусь.

Мне прыемна адзначыць, што кожны неабыякавы да лёсу сваёй краіны беларус меў магчымасць удзельнічаць у распрацоўцы змяненняў у Асноўны Закон. І я перакананая, што грамадзяне таксама актыўна абмяркуюць праект змяненняў і прымуць правільнае рашэнне падчас правядзення рэферэндуму.

Аляксей НЯВЕРАЎ:

«Адмова ад пераўтварэнняў прывядзе да затрымкі развіцця дзяржавы»

ЧЛЕН Савета Рэспублікі, старшыня Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў:

— Неабходнасць правядзення рэферэндуму ў першую чаргу абумоўлена вострай патрэбай абнаўлення дзеючай Канстытуцыі. Плануемыя змены ў палітычным і дзяржаўным кіраванні, а таксама ў галіне вытворча-эканамічных адносін прадыктаваныя сённяшнім становішчам ва ўсім свеце. Адмова грамадства ад дадзеных пераўтварэнняў непазбежна прывядзе да затрымкі развіцця нашай дзяржавы.

Падрыхтавала Вольга АНУФРЫЕВА.

ЗАХАВАЦЬ МЕМАРЫЯЛ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

Камісія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі разгледзела праект далейшай рэстаўрацыі і рамонту Брэсцкай крэпасці

У Брэсце працавала камісія Парламенцкага сходу па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях. Адбылося таксама пасяджэнне маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі. Разглядаліся розныя пытанні.

Напрыклад, брастаўчан заклікалі больш актыўна ўдзельнічаць у саюзных праектах. Скажам, у Анапе штогод праходзіць фестываль «Творчасць юных», дзе таленты праяўляюць дзеці да 14 гадоў. А падлеткі, старэйшыя за ўказаны ўзрост, могуць праявіць сябе ў праекце «Моладзь — за Саюзную дзяржаву».

Старшыня камісіі Алена АФАНАСЬЕВА запрасіла да размовы пра супрацоўніцтва ў медыцынскай сферы. Зараз, ва ўмовах пандэміі, гэтае кола пытанняў набывае асаблівую актуальнасць. Напрыклад, у Расіі распрацоўваецца шэраг эфектыўных праграм па рэабілітацыі людзей, якія перахварэлі на каранавірус. А ў такой рэабілітацыі мае патрэбу не менш за 70 працэнтаў былых пацыентаў. І тут адкрываецца шмат магчымасцяў для сумеснай работы. Скажам, можа быць задзейнічаны патэнцыял санаторыяў абедзвюх дзяржаў. Абмен студэнтамі медыцынскіх ВНУ і каледжаў пойдзе на карысць будучым спецыялістам.

Адзначалася, што пэўныя вынікі дасягнуты ў прасоўванні праекта «Работа без межаў», а таксама праграмы аздараўлення ветэранаў і інвалідаў вайны.

Саюзныя дэпутаты разам з членамі маладзёжнай палаты пабывалі ў Брэсцкай крэпасці і азнаёміліся з вынікамі рэалізацыі праекта Саюзнай дзяржавы па капітальным рамонце, рэстаўрацыі і музеефікацыі збудаванняў мемарыяльнага комплексу. Работа праведзена ў 2018—2020 гадах, з саюзнага бюджэту патрачана больш за 300 мільёнаў расійскіх рублёў.

Праграма далейшай рэстаўрацыі і рамонту аб'ектаў Брэсцкай крэпасці стала галоўным пытаннем працы другога дня камісіі Парламенцкага сходу. У абмеркаванні ўзялі ўдзел таксама прадстаўнікі міністэрстваў культуры Беларусі і Расіі, якія падключыліся па відэасувязі. Адзначалася, што праект 2018—2020 гадоў выкананы ў поўным аб'ёме. На разгляд камісіі быў прапанаваны новы праект на наступны перыяд.

Пра кожны з аб'ектаў, які беларускі бок прапануе ўнесці ў праграму, падрабязна расказаў **дырэктар мемарыяльнага комплексу Рыгор БЫСЮК.** Капітальнага рамонту патрабуюць цэнтральны манумент «Мужнасць», плошча якога складае 7200 квадратных метраў, галоўны ўваход у мемарыял «Зорка» і памяшканні побач з ім, Паўночныя вароты з казематамі, якія прымыкаюць да аркі, паўднёва-заходняя казарма, руіны 44-га стралковага палка. У пераліку таксама — 104 казематы двухпавярховай паўднёвай казармы. Тут бачыцца стварэнне мультыкультурнай прасторы з музейна-асветніцкім цэнтрам, гістарычнай бібліятэкай, канферэнц-залай. Працягу рэканструкцыі патрабуе і форт № 5. У руінах 44-га стралковага палка ёсць задумка стварыць мемарыяльную зону «Смутак» — скульптурную кампазіцыю з вобразам жанчыны, якая не дачакалася з вайны сына, мужа, брата, бацькі.

Камісія прыняла рашэнне, у якім рэкамендавала міністэрствам культуры абедзвюх дзяржаў узгадніць з фінансавымі ведамствамі краін бюджэтныя заяўкі на наступныя гады.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 29 снежня 2021 года.

ШТУРШОК ДА РАЗВІЦЦЯ

Калі прыбралі буралом

Дрэвамі заваліла школьны двор у Велікарыце. Побач ёсць сквер, дзе стаіць помнік ваенным падзеям. Дык вось, сквер тады запоўніўся бураломам. Помнік, дарэчы, не зачапіла. І калі завалы прыбралі, стала відавочна, што тэрыторыя патрабуе грунтоўнага добраўпарадкавання: пасадкі новых дрэў, замены дарожак і пляцовак. Тады **старшыня Велікарыцкага сельскага Савета Віктар КІРЫЧУН** прапанаваў кіраўніцтву райвыканкама правесці тут у 2021 годзе раённая «Дажынкі», маючы на ўвазе падрыхтоўчыя работы з адпаведным фінансаваннем.

Прагучалі розныя меркаванні, бо мясцовае сельгаспрадпрыемства праходзіла працэдуру банкруцтва і далучэння да ААТ «Чарняны», а ў такіх кампаніях, як паказаў ранейшы вопыт, гаспадарка бярэ на сябе асноўныя выдаткі. Але старшыня Маларыцкага райвыканкама Міхаіл Бацэнка ідэю падтрымаў.

— Стварылі рабочую групу, і пачалася падрыхтоўка да «Дажынак», — гаворыць Віктар Кірычун. — Аб'ём работ быў даволі вялікі, патрабавалася шмат тэхнікі. Давялося спачатку вывозіць стары грунт, затым завозіць новы. Дапамагалі ўсе. Але асабліва вялікі аб'ём работ правялі ДРБУ-179 і раённая ЖКГ. Памаглі і прыватныя прадпрыемствы, фермерскія гаспадаркі, зарэгістраваныя на тэрыторыі сельсавета. Напрыклад, «ЛегіёнПрамБуд», «ГрынСпрайс» выдзялялі тэхніку, дапамагалі з фінансамі. Нават маладая фермерская гаспадарка «Дзівакрай» далучылася да добрай справы. Усім хацеў шчыра падзякаваць на фестывалі, але «Дажынкі» адмянілі з-за скачка захваральнасці на каранавірус у раёне.

